У што выльецца адсутнасць пырскавікоў

СТАР. 3

Міхаіл Зімянін: роля асобы ў краіне

СТАР. 5

Магія гуку беларускіх цымбалаў

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

10 СТУДЗЕНЯ 2015 г. СУБОТА № 4 (27862) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРЫКЛАД СЛУЖЭННЯ РАДЗІМЕ І ЛЮДЗЯМ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва, прэміі «Беларускі спартыўны Алімп»

Па традыцыі, якая склалася, цырымонія ўзнагароджання ў сталічным Палацы Рэспублікі адбылася ў дні святкавання Раства. Невыпадкова сярод лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» заўсёды бываюць людзі і калектывы, якія жывуць і працуюць па галоўных хрысціянскіх прынцыпах — міласэрнасці і дапамогі блізкаму.

Сёлета высокую ўзнагароду ад кіраўніка дзяржавы атрымалі калектывы Рэспубліканскага інтэрната ветэранаў вайны і працы і вучэбна-вытворчых майстэрняў прыхода храма іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць». Уручаючы прэмію, Прэзідэнт адзначыў: «Беларускі народ заўсёды імкнуўся да стваральнага жыцця, заснаванага на працавітасці, справядлівасці, узаемадапамозе. Таму спакон веку пашанай у нас карыстаюцца людзі, якія працуюць у імя падтрымання гэтых асноватворных маральных прынцыпаў. Мы ўзнагароджваем тых, хто прысвяціў жыццё справе міласэрнасці і дапамогі іншым». Прэзідэнт падкрэсліў, што адна з галоўных мэтаў беларускай дзяржавы — стварэнне ўмоў для самарэалізацыі маладых грамадзян, гатовых аддаваць свае сілы і здольнасці на карысць Айчыны. «І ў гэты ўрачысты дзень мы аддаём даніну павагі людзям, якія кожны дзень працуюць на дасягненне гэтай мэты. Высокіх узнагарод удастоены Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр «Зубраня», Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

На 2015-ы прыпадае 70-годдзе Вялікай Перамогі, нагадаў Аляксандр Лукашэнка. «У Беларусі робіцца ўсё магчымае для захавання памяці пра яе. Мы аберагаем гістарычную праўду і стараемся памятаць яе каштоўныя ўрокі. Дзякуючы працы, таленту работнікаў культуры ў мінулым годзе скончана будоўля Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і створана новая экспазіцыя ў мемарыяльным комплексе «Брэсцкая крэпасць-герой». Заслугі гэтых калектываў мы сёння таксама адзначаем», — сказаў Прэзідэнт.

Усяго па выніках 2014 года прысуджаны пяць прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне». Сярод лаўрэатаў гэтай высокай узнагароды — аўтарскі калектыў у складзе настаяцеля рэлігійнай абшчыны «Прыход храма іконы Божай Маці «Усіх тужлівых Радасць» у Мінску Мінскай епархіі Беларускай праваслаўнай царквы протаіерэя Ігара Карасцялёва і дацэнта Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Марыны Краўцовай. Іх намаганнямі створаны вучэбна-вытворчыя майстэрні пры названым прыходзе для сацыялізацыі людзей з цяжкімі захворваннямі. Лаўрэатам прэміі стаў таксама калектыў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь за ўвасабленне нацыянальна-гістарычнай тэматыкі ў балеце «Вітаўт». Сярод лаўрэатаў і калектыў Рэспубліканскага інтэрната ветэранаў вайны і працы, які ўнёс вялікі ўклад у развіццё дзяржаўнай сістэмы сацыяльнай абароны, зацвярджэнне ідэй чалавекалюбства і міласэрнасці ў грамадстве. Гэтай узнагароды ўдастоены і Цэнтральны камітэт Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі за значны ўклад у грамадзянскае выхаванне і фарміраванне патрыятычнай самасвядомасці моладзі.

Кіраўнік дзяржавы ўручыў таксама 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва: ансамблю песні і танца «Медуніца» Магілёўскай абласной філармоніі, аўтарскаму калектыву тэлеканала «Сталічнае тэлебачанне» ў складзе дырэктара дырэкцыі спецыяльных праектаў Аляксея Адашкіна, карэспандэнта спецыяльнай службы карэспандэнтаў дырэкцыі інфармацыйнага вяшчання Вольгі Макей; аўтарскаму калектыву ў складзе супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Алены Боганевай і Тамары Варфаламеевай, педагога Цэнтра дадатковай адукацыі «Ветразь» Кастрычніцкага раёна Мінска Мікалая Козенкі. Узнагароды ўдастоены таксама аўтарскі калектыў у складзе дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Людмілы Дамнянковай, дырэктара творча-эксперыментальнага прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Гударт» Пятра Лабковіча, супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Барыса Лазукі. Прэміі ўдастоены калектыў мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой». Сярод узнагароджаных — калектыў творчых майстэрняў «Цэнтра сучасных мастацтваў», калектыў Неглюбскага сельскага цэнтра ткацтва Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Прэмія прысуджана галоўнаму спецыялісту прадпрыемства «Мінская спадчына» Сяргею Багласаву, мастаку-скульптару, члену Беларускага саюза мастакоў Сяргею Бандарэнку, прафесару кафедры малюнка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзіміру Ганчаруку.

Падчас цырымоніі ўшаноўвалі і тых, хто выхоўвае будучых чэмпіёнаў. «Мы хочам, каб здаровы лад жыцця, любоў да спорту, актыўнага адпачынку ў людзей розных узростаў таксама сталі добрай традыцыяй. І, вядома, наша краіна павінна прарастаць яркімі трыумфамі беларускіх прафесійных спартсменаў, якія звязалі сваё жыццё са спортам найвышэйшых дасягненняў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Беларусь даўно і трывала заняла месца ў ліку спартыўных дзяржаў. Прэзідэнт звярнуў увагу, што мінулы год быў яркім і памятным для беларусаў на спартыўныя падзеі. «Упершыню за ўсю гісторыю суверэннай Беларусі мы прымалі сусветны хакейны чэмпіянат. Нашы спартсмены годна паказалі сябе і на Алімпійскіх гульнях у Сочы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Сцэна з балета «Вітаўт».

Лаўрэатамі прэмій «Беларускі спартыўны Алімп» сталі спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы Марына Арзамасава, трэнер-выкладчык установы «Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па гімнастыцы мастацкай» Ірына Ільянкова, трэнер-выкладчык па лёгкай атлетыцы ўстановы «Мінская спецыялізаваная дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву № 2 БФСТ «Дынама» Наталля Шыкаленка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што ўручэнне прэмій «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва, «Беларускі спартыўны Алімп» пацвярджае старажытную ісціну: добрыя справы заўсёды ўзнагароджваюцца. Кіраўнік дзяржавы падзякаваў лаўрэатам за тое, што яны паказваюць прыклад служэння грамадству і шчырай любові да роднай зямлі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўручэнне прэмій «За духоўнае адраджэнне» не выпадкова прымеркавана да Раства Хрыстова. «Бо прыхільнасць да хрысціянскіх каштоўнасцяў, маральных, эстэтычных традыцый з'яўляецца адным з галоўных фактараў у развіцці беларускай нацыі, захаванні яе адзінства», — сказаў Прэзідэнт.

«Да чаго можа прывесці грэбаванне імі, паказваюць падзеі ў нашых суседзяў. Хваля міжнацыянальных, міжканфесійных канфліктаў, тэрарыстычных пагроз ахапіла сёння ўвесь свет», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў гэтых умовах асаблівую каштоўнасць набываюць адзінства і згуртаванасць народа. «Як сказана ў Евангеллі: «Усякае царства, якое раздзялілася самое ў сабе, апусцее, а дом, які раздзяліўся сам у сабе, падзе». Гісторыя вучыць, што толькі мір і згода служаць надзейным падмуркам дабрабыту любой краіны. Менавіта на гэтым падмурку мы будзем будаваць і будуем нашу дзяржаву», — заявіў беларускі лідар.

Беларусь адкрыта для засваення сусветнага вопыту. «Але, спасцігаючы культуру іншых народаў, важна не растварыцца ў ёй, не страціць свой твар. Мы ўзнагароджваем тых, хто стварае сучасныя творы ў розных жанрах, абапіраючыся на нашу мастацкую спадчыну, светапогляд і традыцыі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле БЕЛТА.

Протаіерэй Ігар Карасцялёў.

Фота БЕЛТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ІАСУБ, фінансавы аналітык:

«Прывязка курсу беларускага рубля да кошыка замежных валют зробіць нацыянальную валюту больш гнуткай да ўнутранай і знешняй эканамічнай сітуацыі. Гэта значыць, што зараз курс валют будзе мяняцца ў адпаведнасці з сітуацыяй у эканоміцы, з фундаментальнымі фактарамі, з тым, што адбываецца ў эканоміцы краін-суседзяў. Беларускі рубель такім чынам стане больш гнуткім, гэтага яму не хапала летась, што, па сутнасці, і прывяло да негатыўных тэндэнцый на фінансавым і валютным рынках краіны ў канцы снежня. Што б ні адбывалася ў Расіі, наша нацыянальная валюта пастаяннымі тэмпамі зніжалася да долара. Да расійскага рубля яна, наадварот, умацавалася, што ў выніку выклікала валютную паніку. Для таго каб гэта не паўтарылася, вярнуліся да прывязкі не да адной валюты, а да ўсіх, якія выкарыстоўваюцца ў знешнеэканамічным абароце».

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

15 студзеня 2015 года ў 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне сёмай пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

■ Падаткі

ПАД ІЛЬГОТЫ ТРАПІЎ І ЖЫЛЛЁВЫ ЛІЗІНГ

А ЗАМЕЖНЫЯ ПАЗЫКІ БУДУЦЬ АБКЛАДАЦЦА ПАДАТКАМ ТОЛЬКІ Ў ВЫКЛЮЧНЫХ ВЫПАДКАХ

Адгулялі мы з вамі працяглыя святы і пачаліся шэрыя будні чарговага года. Ці ўсё мы зрабілі, што планавалі летась? Не кожны наш чытач на гэта адкажа станоўча. А вось падатковыя органы па крэатыўныя распрацоўкі ў чужую кішэнь не палезуць: што запланавалі — абавязкова выканаюць. Аб новаўвядзеннях, якія чакаюць нашага сумленнага падаткаплацельшчыка, карэспандэнту «Звязды» расказала намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Святлана Шаўчэнка.

ПАДАХОДНЫ ПАДАТАК — ПЛЮС 1%

Мабыць, самая галоўная навіна новага сезона ў тым, што з першых дзён года павялічваецца стаўка падаходнага падатку з 12 да 13%. Паводле інфармацыі міністэрства, гэтая мера накіравана на стварэнне ў бюджэце дадатковай крыніцы сродкаў, якія плануецца накіроўваць на фінансаванне дзяржаўнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі. Усе гэтыя грашовыя сродкі накіроўваюцца ў бюджэт, а далей іх размеркаванне ажыццяўляецца Міністэрствам фінансаў згодна з адпаведнымі зацверджанымі праграмамі па дзяржбюджэце.

БАНКІ ГРОШЫ ВЯРНУЛІ — І ДЗЯКУЙ ІМ

Сёлета Падатковы кодэкс краіны ўдакладняецца ў адпаведнасці з дзеючымі ўказамі Прэзідэнта Беларусі. Напрыклад, уведзена норма, якая рэгулюецца Указам кіраўніка дзяржавы № 493 ад 16 кастрычніка 2014 года «Аб развіцці безнаяўных разлікаў». Таму сума грашовых сродкаў, якая кампенсуецца банкамі фізічным асобам у выпадку выкрадання іх з рахункаў плацёжных картак, што эмітуюцца гэтымі фінансавымі ўстановамі, не будзе абкладацца падаткам. Цяпер гэтая норма не толькі прапісана ва Указе, але і адлюстравана ў Падатковым кодэксе. Гэта новаўвядзенне пачне дзейнічаць з 19 красавіка 2015 года.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ФРАНЦЫІ ЗАХАПІЛІ ЗАЛОЖНІКАЎ

Учора за 50 кіламетраў на поўнач ад Парыжа адбылася спецаперацыя па затрыманні Шэрыфа і Саіда Куашы, якіх падазраюць у бойні, наладжанай у рэдакцыі часопіса Charlie Hebdo. Братам удалося захапіць заложнікаў пасля пагоні, што суправаджалася стралянінай. У хуткім часе з'явілася неафіцыйная інфармацыя пра ахвяр, якую, аднак, пракуратура Парыжа не пацвердзіла. Браты Куашы ўгналі аўтамабіль у мястэчку Дамартэн-ан-Гоэль (за 12 км ад аэрапорта імя Шарля дэ Голя). Падазраваных выявілі на адрэзку нацыянальнай аўтатрасы, дзе яны пачалі страляніну па паліцэйскіх. У пагоні было задзейнічана пяць верталётаў, перадае Reuters. Падазраваныя ўгналі аўтамабіль Peugeot 206, за рулём якога знаходзілася жанчына. Злачынцы адпусцілі пацярпелую, што пазней апазнала ў тых, хто нападаў, братоў Куашы. Пасля зламыснікі забарыкадаваліся ў друкарні, дзе ўтрымлівалі некалькі заложнікаў.

Тым часам служба бяспекі Вялікабрытаніі папярэджвае аб небяспецы маштабных тэрактаў, арганізаваных ісламскімі тэрарыстамі, піша The Guardian. Гэтыя злачынствы могуць быць учынены як у Вялікабрытаніі, так і ў іншых краінах Захаду.

У ЗША ЗАРЭГІСТРАВАНА ПЕРШАЕ БАНКРУЦТВА КАМПАНІІ ПА ЗДАБЫЧЫ СЛАНЦАВАЙ НАФТЫ



У ЗША збанкрутавала першая кампанія па распрацоўцы сланцавых радовішчаў і здабычы з іх нафты. Заяву пра банкруцтва і абарону ад крэдытораў на гэтым тыдні падала тэхаская кампанія WBH Energy. Яе запазычанасць дасягнула 50 мільёнаў долараў у выніку рэзкага зніжэння коштаў на сырую нафту ў апошнія месяцы. У ЗША ўжо некалькі гадоў назіраўся сапраўдны энергетычны бум. Многія кампаніі, уключаючы некалькі японскіх карпарацый, пачалі распрацоўваць сланцавыя радовішчы нафты і газу ў Паўночнай Амерыцы ў спробе атрымаць выгаду з адносна нізкіх выдаткаў на гэты працэс. Аднак рэзкае падзенне нафтавых катыровак да ўзроўню ніжэй за 50 долараў за бараль рэзка ўскладніла дзелавы клімат у сланцавым сектары.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

БРУСЕЛЬСКАЯ КАПУСТА — САКРЭТНАЯ ЗБРОЯ СУПРАЦЬ РАКУ

Паводле слоў навукоўцаў, брусельская капуста — сапраўдны суперпрадукт. У місцы брусельскай капусты ўтрымліваецца 240% рэкамендаванай дзённай нормы вітаміну K_1. Таксама ў ёй амаль 130% ад дзённай нормы вітаміну С, піша Zee News. Даследаванне паказала: брусельская капуста багатая на клятчатку, марганец, калій, халін і вітаміны групы В. Даказана, што яе антыаксіданты і іншыя фітахімічныя рэчывы паспяхова змагаюцца з хранічнымі захворваннямі. Акрамя таго, брусельская капуста знішчае перадракавыя клеткі, прадухіляючы гэтым развіццё анкалагічных захворванняў. Удзельнікі іншага даследавання, праведзенага раней, кожны дзень на працягу 5 тыдняў з'ядалі каля 1,5 міскі брусельскай капусты. Пасля гэтага ў іх на 28% зменшылася колькасць пашкоджанняў ДНК. А яшчэ брусельская капуста дапамагае зачаць дзіця. У ёй змяшчаецца фоліевая кіслата, якая павышае паказчыкі фертыльнасці ў мужчын і жанчын.

КАРОТКА

Вытворчасць калійных угнаенняў «Беларускалія» за 2014 год дасягнула рэкордна-га паказчыка за ўсю гісторыю прадпрыемства — 10336,5 тыс. тон, што на 48% больш, чым у 2013 годзе.

У Беларусі ўведзена плата за рэгістрацыю інфармацыйных сетак, сістэм і рэсурсаў нацыянальнага сегмента сеткі інтэрнэт.

Вялікія партыі мяса птушкі і яек прадпрыемстваў «Агракамбінат «Скідзельскі» і Гродзенскай птушкафабрыкі забаранілі да ўвозу ў Расію.

Купіць зямельны ўчастак у Мінскім раёне можна толькі з аўкцыёну.

У горадзе Грайфсвальд (Германія) 8 студзеня адкрылася выстаўка сучаснай беларускай графікі і жывапісу, арганізаваная Пасольствам Беларусі ў Германіі.

Па выніках пятага этапу ралі-рэйду «Дакар-2015» экіпаж беларускай каманды «МАЗ-СПОРТаўта» пілота Сяргея Вязовіча ў класе грузавікоў (Т4) заняў 3-е месца.

Амаль 17 тыс. жыхароў Віцебскай вобласці прымуць удзел у мерапрыемствах Сусветнага дня снегу 17–18 студзеня.

■ Анатомія жыцця

ПАД АДНЫМ ДАХАМ

Нягледзячы на камфортныя ўмовы ў доме сумеснага самастойнага пражывання, адзінокім пенсіянерам нялёгка пакідаць свае хаты

За апошняе дзесяцігоддзе колькасць пажылых людзей (тых, каму больш за 60 гадоў) у нашай краіне павялічылася амаль на 75 тысяч чалавек. Многія з іх жывуць адны ў вёсках і з-за свайго ўзросту ці фізічнага стану ўжо не могуць займацца гаспадаркай і хатнімі справамі. Каб палегчыць жыццё гэтай катэгорыі насельніцтва, была ўведзена такая форма сацыяльнай дапамогі, як дамы сумеснага самастойнага пражывання. У спецыяльна пабудаванай хаце пенсіянеры разам жывуць самастойна і за свой кошт: цалкам аплачваюць камунальныя паслугі, прадукты. Штодзень суполку старых наведвае сацработнік, для якога гэта таксама прасцей, чым аб'ехаць на ровары (не заўсёды ёсць машына) некалькі вёсак. Каб даведацца, як зімуюць пенсіянеры пад адным дахам, мы наведалі дом сумеснага самастойнага пражывання ў аграгарадку Бялкоўшчына Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці.

ВЫДАТКІ — ПАРОЎНУ

Дом для адзінокіх старых адкрылі чатыры гады таму ў адрамантаваным памяшканні былога сельсавета. Літаральна праз дарогу — крама, аддзяленне пошты, фельчарскі пункт. У самім будынку правялі гарачую воду і зладзілі газавае ацяпленне. Зрабілі санвузел: у душавой кабіне нават крэселка паставілі, каб пажылым людзям было лягчэй мыцца.

Цяпер у доме жыве дзесяць чалавек. Сямі з іх больш за 80 гадоў. Асноўныя выдаткі пенсіянеры дзеляць пароўну: у месяц кожны плаціць паўтара мільёна рублёў. Для параўнання: сабекошт знаходжання ў бальніцы сястрынскага догляду за такі ж перыяд складае каля трох з паловай мільёнаў. Калі для аплаты стацыянара пацыенты пераводзяць на рахунак бальніцы 80 працэнтаў сваёй пенсіі (незалежна ад яе памеру), то ў доме самастойнага сумеснага пражывання плацяць пэўную суму. Астатнімі грашыма старыя распараджаюцца самі.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

Хутчэй, вышэй, мацней

Наша краіна гатова прыняць у сябе міжнародныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы самага высокага ўзроўню

Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы з прэзідэнтам Еўрапейскай лёгкаатлетычнай асацыяцыі Ханс-Ёргам Вірцам, паведамляе БЕЛТА.

«Калі ў вас будзе інтарэс да Беларусі ў сувязі з правядзеннем тут розных сустрэч, канферэнцый, міжнародных спаборніцтваў, вы можаце заўсёды на нас разлічваць», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі гатовы стварыць усе неабходныя ўмовы для правядзення міжнародных лёгкаатлетычных спаборніцтваў самага высокага ўзроўню. «Мы ўмеем гэта рабіць, і нядаўні чэмпіянат свету па хакеі гэта паказаў. Ён стаў найлепшым у гісторыі чэмпіянатаў свету. Таму можаце разлічваць, што і лёгкаатлетычны форум, які тут, магчыма, адбудзецца, будзе такім самым», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка таксама падзякаваў Ханс-Ёргу Вірцу за ўвагу, што ўдзяляецца Беларусі ў частцы развіцця лёгкаатлетычнага спорту. «Гэта для нас вялікі стымул для развіцця лёгкай атлетыкі. Дзякуй вам за падтрымку нашай федэрацыі, за ўдзел у падрыхтоўцы трэнераў, перадачу методык, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Мы нядаўна выбралі новага старшыню федэрацыі лёгкай атлетыкі (Вадзім Дзевятоўскі. — **Заўвага БЕЛТА**). Гэта звязана з тым, што мы хочам удзяліць вельмі сур'ёзную ўвагу развіццю лёгкай атлетыкі ў нашай краіне».

Паводле слоў Прэзідэнта, у Беларусі ёсць вельмі добрыя традыцыі па развіцці розных лёгкаатлетычных відаў спорту. «Я лічу, што мы адновім гэтыя школы, і вы ў хуткім часе пачуеце шмат добрага пра беларускіх атлетаў», — дадаў беларускі лідар.

У сваю чаргу Ханс-Ёрг Вірц адзначыў, што за некалькі праведзеных у Беларусі дзён меў магчымасць асабіста ўбачыць дасягненні ў справе стварэння спартыўнай інфраструктуры. «Гатовы пагадзіцца з вашымі словамі, што Беларусь можа прымаць у сябе спартыўныя мерапрыемствы сусветнага маштабу. Цяпер мы ўжо лічым сваім абавязкам прыняць вашу прапанову і скарыстаць яе для правядзення такіх мерапрыемстваў», — сказаў ён.

■ Перспектывы

АДУКАЦЫЯ... НА ЭКСПАРТ

У Бангладэш ужо рыхтуюць пляцоўку для Беларускага міжнароднага ўніверсітэта

Сёння вышэйшую адукацыю ў беларускіх ВНУ атрымліваюць 13,9 тысячы замежных грамадзян. У БДУІР навучаюцца 530 студэнтаў і магістрантаў з розных краін свету. Але ў недалёкай будучыні колькасць іншаземных студэнтаў, падрыхтаваных беларускімі выкладчыкамі, можа значна ўзрасці. Калі праект па стварэнні Беларускага міжнароднага ўніверсітэта ў Бангладэш будзе рэалізаваны, то ўжо ў 2016 годзе ўніверсітэт прыме першых 500 студэнтаў, а да 2020 года ў ім будуць навучацца каля 20 тысяч чалавек.

— Дагавор аб супрацоўніцтве паміж БДУІР і кампаніяй Add-MoreServices па стварэнні сумеснага ўніверсітэта быў падпісаны падчас нашага візіту ў Бангладэш восенню мінулага года, — расказвае **рэктар БДУІР Міхаіл БАТУРА.** — У ім, у прыватнасці, прапісаны асноўныя палажэнні па рэалізацыі сумеснага праекта і зафіксаваны пункт аб неабходнасці распрацоўкі бізнес-плана да мая 2015 года. Плануецца, што ў маі гэтага года дэлегацыя з Бангладэш наведае БДУІР, і пры станоўчым вырашэнні ўсіх пытанняў распачнецца будаўніцтва студэнцкага гарадка.

Падчас перамоў былі вызначаны абавязкі двух бакоў: партнёры з Бангладэш павінны забяспечыць атрыманне ліцэнзіі на адукацыйную дзейнасць, пабудаваць універсітэцкі кампус і абсталяваць вучэбныя карпусы сучаснай тэхнічнай і вучэбна-лабараторнай базай. Першую частку кампуса (вучэбна-лабараторныя карпусы, інтэрнат для студэнтаў, спартыўныя збудаванні і гасцініцу для беларускіх выкладчыкаў) плануецца адкрыць ужо ў чэрвені 2016 года. Гэта ўсё вымагае сур'ёзных фінансавых выдаткаў. Але і задачы, якія стаяць перад беларускім бокам, простымі не назавеш.

Да чэрвеня 2016 года нам трэба падрыхтаваць выкладчыцкі корпус і арганізаваць навучанне студэнтаў па пяці спецыяльнасцях з поўным вучэбна-метадычным забеспячэннем навучальнага працэсу на англійскай мове, прычым як на папяровых, так і на электронных носьбітах. Неабходна забяспечыць выкладанне па вочнай і дыстанцыйнай формах навучання, атэстацыю і выдачу дыпломаў.

Між іншым, Міхаіл Батура ўпэўнены, што яны з гэтай задачай справяцца, бо першай ВНУ ў краіне, якая распачала падрыхтоўку замежных грамадзян на англійскай мове, стаў менавіта Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі. У 2009 годзе быў ажыццёўлены набор на першую ступень навучання, а затым і ў англамоўную магістратуру.

Але, па словах Міхаіла Батуры, выкладчыкаў, якія свабодна размаўляюць на англійскай мове, значна больш, чым выкладчыкаў, гатовых на англійскай мове выкладаць, асабліва тэхнічныя дысцыпліны. І гэта адзін з галоўных фактараў, які стрымлівае далейшае пашырэнне аб'ёмаў і напрамкаў падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй на англійскай мове. Менавіта таму кіраўніцтва БДУІР неаднойчы выступала з ініцыятывай аб стварэнні рэспубліканскай базы спецыялістаў, гатовых арганізоўваць навучальны працэс на англійскай мове. У Бангладэш работа будзе распачынацца з тых спецыяльнасцяў, па якіх у БДУІР ужо вядзецца англамоўнае навучанне. Праўда, давядзецца падбіраць выкладчыкаў, гатовых працаваць вахтавым метадам.

Але БДУІР — не адзіная ВНУ, якая будзе ўдзельнічаць у стварэнні міжнароднага ўніверсітэта на тэрыторыі Бангладэш. Да праекта далучыцца таксама Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт. Акрамя таго, прадстаўнікі Add-MoreServices хацелі б адкрыць яшчэ і медыцынскі факультэт. Таму Беларускаму дзяржаўнаму медыцынскаму ўніверсітэту таксама паступіла прапанова далучыцца да перспектыўнай справы.

Дарэчы, экспартныя перспектывы, што адкрываюцца перад беларусамі ў Бангладэш, выглядаюць вельмі заманліва. На 160 мільёнаў насельніцтва тут усяго 20 прыватных універсітэтаў і 9 дзяржаўных каледжаў. У 2015 годзе колькасць выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў — патэнцыяльных абітурыентаў ВНУ — складзе 1 млн 253 тысячы. Для параўнання: у Беларусі чакаецца толькі 57 тысяч выпускнікоў. А цэны на навучанне ў мясцовых ВНУ значна вышэйшыя, чым у беларускіх: ад 7 да 20 тысяч долараў.

Такім чынам, праект па стварэнні ў Бангладэш Беларускага міжнароднага ўніверсітэта мае велізарныя перспектывы не толькі для БДУІР, але і для іншых універсітэтаў нашай краіны...

Надзея НІКАЛАЕВА

■ У парламенце

ЭЛЕКТРОННЫЯ «АНАНІМКІ» РАЗГЛЯДАЦЦА НЕ БУДУЦЬ

У Палаце прадстаўнікоў да другога чытання рыхтуюцца змяненні і дапаўненні ў Закон «Аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб»

У першым чытанні законапраект быў прыняты 19 снежня мінулага года — менш чым праз месяц пасля яго паступлення ў парламент. Аднак праца над карэкціроўкай закона вялася значна даўжэй — па сутнасці адразу пасля яго прыняцця ў 2011 годзе. Пра тое, навошта закон спатрэбілася змяняць і якім ён стане пасля прыняцця паправак, мы распыталі намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Аксану НЯХАЙЧЫК.

— Законапраект паступіў у Пастаянную камісію па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі 25 лістапада мінулага года, але першы яго макет быў накіраваны Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў яшчэ ў студзені 2014-га. На гэтай стадыі дэпутаты ўнеслі каля 30 заўваг і прапаноў. Прапановы паступалі таксама ад грамадзян, прадстаўнікоў мясцовай выканаўчай улады, міністэрстваў і ведамстваў. У выніку макет законапраекта змяняўся тройчы.

— Чым прадыктавана неабходнасць карэкціроўкі Закона «Аб звароце грамадзян і юрыдычных асоб»?

— Закон 2011 года патрабуе змянення ў сувязі з напрацаваным практычным вопытам па яго рэалізацыі, галоўным чынам — з укараненнем электронных зваротаў. Увесь гэты час паступалі прапановы і заўвагі ў тым ліку і ў нашу камісію. Для маніторынгу работы закона «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» парламенцкая камісія правяла два выязныя пасяджэнні ў Астраўцы і Навагрудку. Такім чынам, тэкст, які паступіў у ніжнюю палату парламента ў лістападзе, стаў вынікам агульнай работы ўсіх зацікаўленых бакоў: і дэпутатаў, і дзяржаўных органаў, і грамадзян.

Удакладняюцца змест і дэталёвы алгарытм разліку выдаткаў, што могуць быць спагнаныя з заяўніка ў выпадку сістэматычных беспадстаўных зваротаў.

— Якія прапановы ад дзяржаўных органаў не былі падтрыманы?

— Не была падтрымана прапанова выключыць са сферы дзеяння закона звароты па атрыманне агульнадаступнай інфармацыі і звароты па тлумачэнні заканадаўства. Не падтрымана была прапанова аб выключэнні электронных зваротаў.

— Якія асноўныя нововаўвядзенні прайшлі першае чытанне?

— Выключэнне са сферы дзеяння закона зваротаў, якія паступаюць ад членаў прафсаюза і іншых грамадскіх арганізацый. Канкрэтызацыя прычын адмовы службовай асобы ў асабістым прыёме або запісе на такі прыём грамадзяніну. Гэта прапанова паступіла ў парламент ад грамадзян яшчэ на стадыі абмеркавання макету законапраекта.

Прадугледжваецца права арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў запытваць неабходныя для вырашэння пытанняў, якія выкладзены ў звароце, дакументы або прыцягваць заяўнікаў да разгляду зваротаў з выездам на месца.

На практыцы часта ў арганізацыі паступаюць ідэнтычныя звароты або дадаткі да ўжо накіраванага звароту, і тады ўзнікае пытанне: як у такіх выпадках адказваць — на кожны зварот асобна ці ўсім адразу? Законапраект дазваляе накіроўваць агульны адказ у тэрмін, які адведзены для першага звароту з аналагічных. Такім чынам, тэрміны не будуць зацягнутыя.

Удакладняюцца змест і дэталёвы алгарытм разліку выдаткаў, што могуць быць спагнаныя з заяўніка ў выпадку сістэматычных беспадстаўных зваротаў у адну і тую ж арганізацыю ці да аднаго і таго ж індывідуальнага прадпрымальніка, а таксама ў выпадку звароту, які мае загадзя ілжывыя сведчанні. Такая норма існуе ў дзеючым заканадаўстве, але не было канкрэтызацыі.

Праект закона прадугледжвае змяніць парадак разгляду электронных зваротаў. Гэта форма сябе апраўдала, яна актыўна выкарыстоўваецца беларусамі, але з ёй узніклі складанасці. Напрыклад, не заўсёды ёсць кантакты заяўніка, звароты могуць згубіцца сярод вялікай колькасці электронных пісьмаў. Таму прапануецца зрабіць абавязковым разгляд звароту, які паступіў праз спецыяльную рубрыку на афіцыйным сайце арганізацыі, а звароты, што прыйшлі па электроннай пошце, кіраўнік можа разглядаць на сваё меркаванне.

Праект канкрэтызуе патрабаванні да электроннага звароту па аналогіі з патрабаваннямі да пісьмовых: ён павінен змяшчаць інфармацыю пра месца жыхарства, прозвішча і імя заяўніка. Калі электронны зварот накіраваны не заяўнікам, а яго прадстаўніком, прапануецца прыкладаць электронныя копіі дакументаў, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы апошняга. Для абароны персанальных дадзеных прадугледжана магчымасць прадубліраваць зварот у пісьмовым або вусным выглядзе.

Калі на сайт паступаюць аналагічныя звароты ад розных грамадзян, даецца магчымасць адказваць таксама праз сайт.

— Аднойчы на асабісты прыём да дэпутата парламента, куды быў запрошаны журналіст «Звязды», прыйшла жыхарка аграгарадка ў Мінскім раёне. Яна расказала пра замену даху ў шматкватэрным доме, дзе за дзень да заканчэння работ будаўнікоў паравялі на іншы аб'ект. У тую ноч моцны лівень заліў усе кватэры, сапсаваў сцены, мэблю, электраправодку. Высветлілася, што будаўнікі былі пераведзены на іншы аб'ект пасля «прамой лініі» з высокім абласным начальствам, якое паабяцала некаму з заяўнікаў хутка вырашыць яго праблему. Гэта сітуацыя мяне вельмі ўразіла. Ці не пераўтвараецца работа са зваротамі грамадзян у нашай краіне ў «паказуху» і ці прадугледжвае новы варыянт закона супрацьдзеянне падобнай практыцы?

— Сітуацыі, калі падчас асабістага прыёму грамадзян іх праблемы вырашаюцца за кошт інтарэсаў іншых людзей, дыскрэдытуюць уладу. Распрацоўшчыкі законапраекта, дэпутаты і юрысты пагадзіліся, што наспела неабходнасць правядзення сур'ёзнай вучобы прадстаўнікоў органаў улады, якія працуюць са зваротамі грамадзян. Гэта магло б выпрацаваць адназначны падыход да іх. Заўсёды ёсць суб'ектыўны фактар, і на паперы ўсё не прапішаш. Адзін лічыць, што адказаў па сутнасці, іншы з гэтым не згодны. Мае месца падыход «абы адпісаца», «абы ўкласціся ў тэрмін», а сітуацыя не вырашаецца. І калі заяўнік больш не звяртаецца, пра яе забываюць. На жаль, такое ёсць.

Сітуацыі, калі падчас асабістага прыёму грамадзян іх праблемы вырашаюцца за кошт інтарэсаў іншых людзей, дыскрэдытуюць уладу.

Трэба мяняць псіхалогію прадстаўнікоў дзяржаўных органаў. Не трэба бачыць ва ўсіх, хто звяртаецца, аматараў паскардзіцца. Калі пытанне можна было вырашыць на першасным узроўні, але яно дахадзіць да больш высокага, то адбываецца тое, пра што вы расказалі: высокапастаўлены чыноўнік загадвае вырашыць яго без прамарудвання. Аднак такога б не было, калі б праблема была знятая ў самым пачатку.

Прававая культура беларусаў расце, і прыйшоў час накіраваць работу са зваротамі ў канструктыўную плынь. У большасці выпадкаў людзі не патрабуюць ад уладаў немагчымага. Да таго ж людзі ў нас, у большасці выпадкаў, імкнуцца вырашыць свае праблемы самастойна.

Тым не менш права грамадзян на зварот у дзяржаўныя органы гарантуе артыкул 40 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Апроч таго, гэта адна з формаў рэалізацыі беларусамі свайго права на ўдзел у кіраванні справамі дзяржавы, якое замацавана ў артыкуле 37 Канстытуцыі.

Нарэшце, звароты з'яўляюцца важнай крыніцай інфармацыі для рашэння дзяржаўных пытанняў, сведчаць пра грамадскія працэсы і адносіны грамадзян да органаў дзяржаўнай улады.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Факт

ПРАВЫ КІРОЎЦЫ «ПАЦЯЖЭЛІ»

У краіне павялічана стаўка дзяржаўнай пошліны за прыём экзаменаў на права кіравання транспартным сродкам.

Як паведамілі нам ва УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, цяпер за тэарэтычны кваліфікацыйны экзамен на права кіравання транспартным сродкам яна складзе 0,3 базавай велічыні (54 тысячы рублёў). Дагэтуль стаўка дзяржаўнай пошліны была роўная 0,05 базавай велічыні. За практычны кваліфікацыйны экзамен на права кіравання транспартным сродкам стаўка дзяржаўнай пошліны складзе: для матацыклаў — 0,7 базавай велічыні (126 тысяч рублёў), дагэтуль было 0,05 базавай велічыні; для іншых транспартных сродкаў (за выключэннем мапеда) — 1 базавая велічыня (180 тысяч рублёў), было 0,1 базавай велічыні.

БЫТАВЫЯ ПАСЛУГІ — ТОЛЬКІ З РЭЕСТРА

Міністэрства гандлю нагадвае, што для ажыццяўлення дзейнасці па аказанні бытавых паслуг суб'екты прадпрымальніцкай дзейнасці абавязаныя зарэгістравацца ў дзяржаўным інфармацыйным рэсурсе «Рэестр бытавых паслуг Рэспублікі Беларусь».

Апошні тэрмін абавязковай рэгістрацыі ў рэестры — 1 чэрвеня 2015 года. З гэтай даты забараняецца аказваць бытавыя паслугі без уключэння ў Рэестр бытавых паслуг. Падставай для гэтага з'яўляюцца заявы суб'екта, які аказвае бытавыя паслугі. Пры неабходнасці ўключэння ў Рэестр бытавых паслуг звестак у адносінах да некалькіх аб'ектаў бытавога абслугоўвання і (ці) форм бытавога абслугоўвання суб'ект прадастаўляе заявы асобна па кожным аб'екце бытавога абслугоўвання і (ці) форме бытавога абслугоўвання ў адпаведныя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Апошнія цягам трох рабочых дзён разглядаюць заявы, вядуць зверку звестак, перадаюць іх у Міністэрства гандлю для прыняцця рашэння пра ўключэнне ў Рэестр бытавых паслуг. Факт рэгістрацыі ў ім пацвярджаецца пасведчаннем, якое выдае міністэрства.

Сяргей РАСОЛЬКА

ЗАТРЫМАНА 40 ТОН ПІРАТЭХНІКІ

На пункце пропуску «Новая Рудня» Гомельскай мытні затрыманы грузавыя аўтамабілі з вялікай колькасцю піратэхнікі. Машыны ішлі з Польшчы ў Расійскую Федэрацыю. За рулём былі грамадзяне Украіны.

Да мытнага афармлення кіроўцамі былі прадстаўлены таварасуправаджальныя дакументы, паводле якіх у паўпрычэпах знаходзіцца больш за 6 мільёнаў штук розных піратэхнічных вырабаў агульнай вагой каля 40 000 кг, ацэненых у 4 мільярды беларускіх рублёў. У прэс-групе Гомельскай мытні паведамілі, што піратэхнічныя вырабы з'яўляюцца абмежаванымі таварамі і іх увоз ці вываз дапускаецца пры наяўнасці спецыяльнага дазволу. Гэты дакумент перавозчыкамі прадстаўлены не быў. Таму піратэхніка канфіскавана, а матэрыялы адміністрацыйных спраў накіраваны ў суд.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Молодечнопиво» (продавец) ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

№	Наименование	Инв. №	Общ. пл., кв.м
1	Склад горючего	630/С-39487	29,8
2	Трансформаторная подстанция	630/С-39488	42,0
3	Трансформаторная подстанция	630/С-39493	44,4
4	Склад тары	630/С-39489	1054,6
5	Магазин	630/С-39492	29,1
6	Заправочная станция	630/С-39494	13,6
7	Гаражи	630/С-39495	128,7
8	Скважина минеральной воды	630/С-39496	27,9
9	Кирпичное пятиэтажное здание главного корпуса	630/С-39908	2693,6
10	Здание мастерских и складских помещений	630/С-39909	939,6
11	Кирпичная одноэтажная проходная	630/С-39910	76,6
12	Цех производства безалкогольных напитков	630/С-39911	1903,0
13	Одноэтажны цех виноделия смешанной конструкции	630/С-41212	1432,9

14	Автомобиль МАЗ 54323	23	Автомобиль ГАЗ 3307
15	Полуприцеп МАЗ 93866	24	Прицеп тракторный
16	Автомобиль МАЗ 53371	25	Автомобиль ГАЗ 3307
17	Трактор МТЗ 82.1	26	Автомобиль МАЗ 5336 А3
18	Автомобиль ГАЗ 3110	27	Автомобиль FIAT DOBLO
19	Полуприцеп МТМ 9330	28	Автопогрузчик 62-8FD18
20	Автомобиль УАЗ 3303	29	**Оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)**
21	Прицеп тракторный		
22	Автомобиль ГАЗ 3307 (по свидетельству об регистрации GAZ 27751-01)		

Указанное недвижимое имущество расположено на земельном участке площадью **3,0952 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования) с кадастровым номером 623850100003000524 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Либава-Роменская, д. 143.

Цех производства безалкогольных напитков (инв. № 630/С-39911) и одноэтажный цех виноделия смешанной конструкции (инв. № 630/С-41212) находятся в залоге (ипотеке). После реализации имущества продавец обязуется исполнить обязательства перед банком для снятия обременения.

Начальная цена составляет с НДС – 27 100 000 000 бел. руб.

Задаток 5% от начальной цены (1 355 000 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (с изменениями и дополнениями).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 06.12.2014.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.01.2015** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2015** до 16.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.

■ Меркаванне

Парадоксы, якія дорага каштуюць

Расстрэл ісламістамі журналістаў французскага сатырычнага часопіса Charlie Hebdo шакаваў Еўропу і выклікаў стыхійную хвалю салідарнасці ва ўсім свеце. На жаль, лозунгі «Захаваем свабоду слова!» ці «Узмоцнім барацьбу з сусветным тэрарызмам!» — гэта толькі абстрактныя пажаданні. Пытанне «Што рабіць?» па-ранейшаму застаецца без уцямнага адказу. Адбываюцца жалобныя мітынгі, прамаўляюцца дзяжурныя фразы, і грамадства зноў засынае да чарговага тэракта. Каб разумець прычыны гэтай сітуацыі, варта зірнуць на праблему еўрапейскага тэрарызму ў больш шырокім кантэксце.

Для Францыі яна не новая. Раней галоўную пагрозу грамадству неслі радыкальныя нацыяналістычныя рухі. Сярод іх сумную вядомасць атрымалі ўласна французскі, карсіканскі, басконскі, алжырскі, палесцінскі і нават армянскі. Апошнія дзесяцігоддзі мода на нацыяналізм зменшылася, затое ў Францыі пачалі з'яўляцца даволі экзатычныя тэрарысты, накшталт анарха-камуністаў, лакальных вінаробаў ці абаронцаў правоў жывёл. Але зараз усіх іх пераўзыходзіць ісламісцкі тэрарызм: у 1990-я адбылася серыя выбухаў у Парыжы, у 2012-м — стральніна ў Тулузе, цяпер — дзёрзкі расстрэл рэдакцыі Charlie Hebdo.

І падобныя працэсы — ва ўсім свеце. З аднаго боку, гэта відавочныя наступствы эмансіпацыі ісламісцкіх радыкалаў, перш за ўсё — у арабскіх краінах, якія да сярэдзіны XX стагоддзя з'яўляліся еўрапейскімі калоніямі. Мясцовыя ўлады, што арыентаваліся на еўрапейскую цывілізацыю і абапіраліся на сілавыя структуры, у апошнія два дзесяцігоддзі не дэманструюць вялікай устойлівасці. Пад ударамі джыхадзістаў хістаюцца Алжыр, Егіпет, Ірак, Ліван, Лівія, Емен, Самалі, Сірыя і г.д.

З выбухам ісламісцкага радыкалізму ўсё зразумела: велізарныя масы слабаадукаванага і беднага насельніцтва арабскіх краін хочуць простых адказаў на складаныя пытанні. І радыкалы гэтыя прывабныя адказы прапануюць. Таму з такой лёгкасцю экстрэмісты маніпулююць народнымі масамі. Але яшчэ больш цікавымі выглядаюць безадказныя паводзіны Захаду ў гэтай сітуацыі: еўраатлантычныя эліты ў сваю чаргу спрабуюць маніпуляваць лідарамі джыхадзістаў. Атрымліваецца гэта шторах горш, джын экстрэмізму ўсё часцей выходзіць з-пад кантролю і атакуе былых гаспадароў.

Гэтым і тлумачацца дзеянні еўрапейскіх палітыкаў, якія, на першы погляд, здаюцца абсалютна непаслядоўнымі. Самы яскравы прыклад апошніх часоў — Сірыя. Спачатку заходнім элітам не падабаўся ваенны рэжым Башара Асада, які нібыта парушаў правы чалавека, і яны паспрабавалі яго знішчыць пад выглядам «арабскай вясны» і рэлігійнай апазіцыі. Ісламісты пры гэтым атрымлівалі шчодрую дапамогу Захаду, а Францыя ледзьве не скіравала авіяносец «Шарль дэ Голь» супраць «злачыннага сірыйскага дыктатара» ў жніўні 2013 года. Але неўзабаве сітуацыя выйшла з-пад кантролю: ісламісты з дапамогай масавага тэрору спачатку адціснулі ў цень сваіх праеўрапейскіх саюзнікаў, стварылі «Ісламскую дзяржаву Ірака і Леванта» (ІДЗІЛ), а потым абвясцілі новы халіфат. У выніку некалькі краін Блізкага Усходу знаходзяцца на мяжы маштабнай вайны, Еўропа захлынаецца ад нелегальнай міграцыі і чакае новую хвалю тэрарызму. І вось парадокс: Францыя і ЗША вымушаны зараз

дапамагаць «сірыйскаму дыктатару» стрымліваць баевікоў-ісламістаў, тых самых, што ажыццявілі напад у Парыжы.

Зараз можна пачуць, што карыкатурысты Charlie Hebdo самі вінаваты ва ўласнай гібелі, бо справакавалі экстрэмістаў сваімі малюнкамі. Можна хіба пагадзіцца, што журналісты недастаткова дбалі пра ўласнаю бяспеку, але асноўная віна ў іх гібелі — усё ж на еўрапейскіх элітах, якія ўласнаручна выгадавалі звера ісламісцкага экстрэмізму, не стварыўшы адэкватнай сістэмы еўрапейскай антытэрарыстычнай бяспекі, а зараз льюць кракадзілавы слёзы па «непаліткарэктных карыкатурыстах».

Але гэтым праблема не вычэрпваецца. Галоўны вынік — масавая міграцыя ў Еўропу жыхароў трэцяга свету, якія не падзяляюць еўрапейскія каштоўнасці і жывуць закрытымі суполкамі. Праблема — унутры самога еўрапейскага грамадства, што за апошнія 200 гадоў драматычна секулярызавалася і згубіла ўласную культурную ідэнтычнасць, ператварыўшыся ў арыфметычную суму касмапалітычных спажыўцоў, прасякнутых ідэалогіяй мультыкультуралізму і талерантнасці. Мігранты са сваёй моцнай рэлігійнай і нацыянальнай ідэнтычнасцю грэбліва і з нянавісцю ставяцца да карэнных еўрапейцаў — як да «іванаў-бязродзічаў». У той жа час з сацыяльна-эканамічнага пункту гледжання еўрапейцы нагадваюць новых рабаўладальнікаў і ставяцца да мігрантаў, як да людзей другога гатунку, пазбаўляючы іх доступу да сацыяльных ліфтаў. Такім чынам, да нацыянальнай і рэлігійнай напружанасці далучаецца самы небяспечны складнік — сацыяльны.

Гісторыя вучыць, што гэта можа скончыцца вельмі кепска. Адзін з вядомых прыкладаў — Ліван, які ў 60-я і 70-я гады XX стагоддзя быў квітнеючай краінай еўрапейскай арыентацыі з пераважна хрысціянскім насельніцтвам. Раптоўнае з'яўленне вялікай колькасці палесцінскіх бежанцаў справакавала працяглую грамадзянскую вайну — і з тых часоў Ліван ляжыць у руінах.

Ці знойдуць Францыя і ўся Еўропа сілы мабілізавацца і прадухіліць грамадзянскую вайну на сваёй зямлі альбо працягнуць безадказныя інтрыгі на Блізкім Усходзе і мультыкультуральныя эксперыменты над уласным насельніцтвам — пытанне адкрытае. Але пакуль усё ідзе па найгоршым сцэнарыі. Паўплываць на лёс усёй Еўропы Беларусь не можа, але пэўныя высновы для сябе зрабіць мы абавязаны.

Мігранты са сваёй моцнай рэлігійнай і нацыянальнай ідэнтычнасцю грэбліва і з нянавісцю ставяцца да карэнных еўрапейцаў — як да «іванаў-бязродзічаў».

Ва Украіне працягваецца грамадзянская вайна, чаму пагроза тэрарызму і бандытызму абвастраецца і для нас. Трэба навучыцца жорстка спыняць экстрэмізм у любым выглядзе: нацыяналістычным, рэлігійным, сацыяльным, экалагічным і г.д. Таму трэба мець доўгатэрміновую стратэгію кіравання працэсамі міграцыі. Перавагу трэба аддаваць мігрантам, цывілізацыйна блізкім да беларусаў, якія здольныя хутка інтэгравацца ў наша грамадства. Але галоўнае — нам, беларусам, трэба згуртавацца дзеля захавання міру і спакою, што з'яўляюцца галоўнай каштоўнасцю нашай краіны.

Аляксандр СІНКЕВІЧ

■

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ИООО «Датч Стар»,

опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181,

строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:

«...стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир площадью от 65 до 72 кв.м при первоначальном взносе 30% – 1 550 (тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США, при первоначальном взносе 50% – 1 500 (тысяча пятьсот) долларов США, при 100% оплате – 1 450 (тысяча чтыреста пятьдесят) долларов США; площадью от 83 до 91 кв.м при первоначальном взносе 30% – 1 500 (тысяча пятьсот) долларов США, при первоначальном взносе 50% – 1 450 (тысяча четыреста пятьдесят) долларов США; при 100% оплате – 1 400 (тысяча четыреста) долларов США; двухуровневые квартиры при первоначальном взносе 50% – 1 450 (тысяча четыреста пятьдесят) долларов США; при 100% оплате – 1 400 (тысяча четыреста) долларов США. При первоначальном взносе 30–50% рассрочка оставшейся суммы до конца октября 2015».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел.: 8 (017) 306 20 90, 8 (029) 380 26 80 или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости).

УНП 191061436

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ЗАО «Белкоммунстроймонтаж»,

опубликованной в газете «Звязда» от 26.01.2013 г. №16

строительства 20-этажного односекционного жилого дома со встроенными помещениями общественного назначения и гараж-стоянкой открытого типа в границах ул. Каховская – Оршанская – Орловская – Смогговский тракт, г. Минск

«…стоимость 1 кв.м: для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартиры площадью 94,68 кв.м – 1500 (тысяча пятьсот) долларов США; площадью от 116 до 118 кв.м – 1400 (тысяча четыреста) долларов США; нежилых помещений в цокольном этаже – 1650 (тысяча шестьсот пятьдесят) долларов США, на первом этаже площадью менее 80 кв.м – 2000 (две тысячи) долларов США, площадью более 80 кв.м – 1800 (тысяча восемьсот) долларов США. Машино-место в паркинге – 32 000 (тридцать две тысячи) долларов США».

Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704, тел. 8 (017) 306-20-90 или у уполномоченных риэлторов (агентств недвижимости).

УНП 101019973

ПАД АДНЫМ ДАХАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ёсць у доме і крызісны пакой, дзе пажылы чалавек, якому з пэўных прычын стала цяжка знаходзіцца ў сям'і, можа часова пажыць. Сацыяльная служба тым часам працуе з яго роднымі. Калі ліквідаваць неспрыяльную сітуацыю не атрымліваецца, чалавеку прапаноўваюць застацца ў доме сумеснага пражывання. Соф'я Іосіфаўна, напрыклад, жыве тут другі год. Уласную хату за сорак кіламетраў адсюль бабе Зосі прыйшлося пакінуць з-за пляменніка-алкаголіка.

— Я там бываю, — кажа Соф'я Іосіфаўна. — У сваячкі ёсць хата недалёка ад маёй, яны, калі сям'-ёй туды едуць, і мяне забіраюць. Але доўга там не магу знаходзіцца, адзін дзень пабуду — і ўсё. Слабаваты ўжо работнік. Хоць хата не старая, печку паліць я яшчэ б змагла. Найгорай, што гэты п'яніца там сядзіць. Я яго і карміла, і папяросы за свае грошы купляла. Тры ці чатыры гады так мучылася. Дык колькі ж я магу цярпець?

Сляпая баба Ванда амаль увесь дзень праводзіць на сваім ложку.

ХАТНЯЯ ЕЖА ЧАТЫРЫ РАЗЫ НА ДЗЕНЬ

Марыя Іосіфаўна з мужам пераехалі пару месяцаў таму. У сваёй хаце сёлета зімаваць стала немагчыма: заваліўся комін.

— Можа, мы ўжо разленаваліся, дзеткі, — уздыхае бабуля. — Мо там і зімавалі б. Ці добра мы зрабілі, што сюды пайшлі, ці блага — Бог ведае. Сабачка застаўся там, суседка корміць. Дзецям прыехаць няма куды. Як мы ў хаце былі, дык яны часцей прыязджалі, то некалькі тыдняў, то месяц пабудуць. А цяпер што? Халодная хата, нікога няма. Дамовіліся з дзедам, што пабудзем тут да мая і паедзем дадому. Там, можа, пасадзім які агарод, дзве соткі зямлі ў нас ёсць.

Кажу пенсіянерцы: вы ўжо напрацаваліся за столькі гадоў, адпачывалі б. Але бабуля не пагаджаецца:

— У нас знаёмыя былі, муж з жонкай. Яны жылі не адны, а разам з нейкімі сваякамі. Прыхварэў мужчына неяк. А жонка была крэпкая. І казала яму: ты яшчэ паляжы, хай іншыя робяць. Сем гадоў праляжаў гэты Мішка. Старому свайму калі скажу: «Што ты, дзед, поўзаеш?», дык ён: «Хочаш, каб, як Мішка, ляжаў?»

Пакуль мы размаўлялі, жанчынам прынеслі салодкія падарункі на святы. Адна з пенсіянерак, баба Ванда (яе суседкі па пакоі расказалі, што старая зусім аслепла і без дапамогі не можа выйсці на двор), ужо паспела паласавацца цукеркамі.

— Баба Ванда, а хто гэта салодкае перад абедам есць? Апетыт нераб'еце, — быццам дзіця, адчытвае пенсіянерку сацыяльны работнік.

— Я толькі адну пакаштавала, — усміхаецца жанчына.

— Бачу я, колькі паперак на падлозе валяецца.

У доме прыемна пахне хатняй ежай. Харчуюцца пенсіянеры чатыры разы на дзень. Гартаю меню: каша манная, бліны са смятанай, суп са шчаўя, катлеты сечаныя з курыцы, дранікі, цэпеліны, творожная запяканка...

— Вой, смачна кормяць, — хваліць кухню Марыя Іосіфаўна. — Мы ў хаце так не елі. І свайго дабаўляць не трэба — хапае. У бальніцы, памятаю, дзесяць дзён ляжала, дык не параўнаць.

З КАРЫБАЎ — У СМАРГОНЬ

На канапе ў пярэднім пакоі размаўляюць мясцовыя мужчыны. Адзін з іх, Анатоль Іванавіч, інвалід 1-й групы, некалі жыў з дачкой на Карыбскіх астравах. Праўда, нядоўга: не змог прызвычаіцца да гарачага клімату.

— Дый у мяне маёмасць тут, пенсія высокая, а там нічога няма, — тлумачыць пенсіянер. — На астравах жыць добра, але ж трэба штосьці ўкласці, каб іншая краіна пра цябе паклапацілася. Лекі там вельмі дарагія. Цяпер мне пакой у Смаргоні прапанавалі. У горадзе жыць буду, заходзьце ў госці. Крамы там побач, зручна. Можа, яшчэ ажанюся апошні раз.

Дзядулю, што сядзеў побач з Анатолем Іванавічам, з хаты выселілі... бабры.

— Я жыў на беразе рэчкі, і бабры пракапалі хады пад хатай. Правалілася ўсё: дзве шафы, ложак. Гэта ноччу здарылася, пакуль спаў, ледзь выбраўся. У сельсавеце пра маю бяду даведаліся, пайшлі шукаць. Але ж там балота — не дабраліся да хаты. Я сам у сельсавет прыйшоў. Мяне ў гэты дом і падсялілі, паўтара года тут жыву, — расказвае Павел Дзмітрыевіч.

На пытанне, чым яны ўдзень займаюцца, старыя жартуюць:

— А нічым во. Гаварыць ужо няма пра што. Усё абмеркавалі за столькі часу. Вось вы прыехалі, і ўжо весялей нам. А дні нараджэння кінулі адзначаць. Што з іх толку? На святы троху лепш пад'ядзім, а так што? У танцы не пойдзем, песні толькі якія паспяваем.

— Нядрэнна тут, але ведаеце, што? Хочацца мне ўсё сваёй хаты. Думаю, мы гэту хату з мамай куплялі, нажывалі. А цяпер кінула... — баба Зося не стрымалася і заплакала.

У доме сумеснага самастойнага пражывання сапраўды камфортна і ўтульна. Але, пагадзіцеся, «адчуваць сябе як дома» і «быць дома» — паняцці розныя. Калі ехала з Бялкоўшчыны, узгадала сваіх бабулю з дзядулем, якія жывуць у вёсцы і ўсё яшчэ знаходзяць сілы весці хатнюю гаспадарку (хоць мы нарэшце і пераканалі іх збыць карову). Штогод стараемся ў хаце штосьці абнавіць: то шпалеры пераклеім, то вокны памяняем. Мінулым летам перарабілі лазню. І старым цяплей, і нам прыемней. А калі няма дзяцей ці яны не могуць (не хочуць?) паклапаціцца пра пажылых бацькоў? Што тады? На жаль, інтэрнаты для пенсіянераў сталі неабходнай прыкметай нашага часу, у якім кожны сам за сябе, а неафішаваныя праявы дабрачыннасці выклікаюць здзіўленне.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Святлана НОРЫК, начальнік упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Смаргонскага райвыканкама:

— Пажылых людзей у Смаргонскім раёне на сёння — больш за 14 тысяч (27 працэнтаў ад усяго насельніцтва). Каля шасцісот чалавек — самотныя. У многіх з іх печы ў хатах разваліліся, дах стары. Выдаткаваць грошы на рамонт кожнага дома не атрымаецца. А пабудаваць якаснае памяшканне, дзе гэтыя пенсіянеры змаглі б жыць, — рэальна. Зразумела, калі адкрывалі ў раёне дом самастойнага сумеснага пражывання, былі пытанні: раптам людзі не заселяцца, не захочуць так жыць? Асцярогі не спраўдзіліся. Цяпер нават адзін чалавек на чарзе стаіць, але пакуль няма месца. Дагавор з пастаяльцамі заключаем на год. Але, як правіла, за гэты час іх хаты становяцца яшчэ горшымі, таму людзі не з'язджаюць. Старыя не толькі жывуць тут у камфортных умовах, але і могуць пагаварыць адно з адным. Іх і школьнікі наведваюць, віншуюць са святамі. А калі адзінокі чалавек жыве на хутары, якія зносіны? Радыё, тэлевізар, кот, сабака — будзем казаць шчыра — уся іх кампанія.

Васіль Яфімавіч (справа) спадзяецца разам з жонкай вярнуцца ўлетку дадому. А яго суседу няма куды пайсці: хата з-за баброў правалілася ў балота.

Нядаўна, дарэчы, у Смаргонскім раёне з'явіўся прыватны дом сумеснага пражывання. Мясцовая сацыяльная работніца, у якой было дзве хаты, прапанавала адну з іх адзінокім старым людзям. Цяпер там жывуць тры пенсіянеры, клопат пра якіх жанчына цалкам узяла на сябе.

■ Крызіс у сям'і

ЧУЖЫЯ СЦЕНЫ ГРЭЮЦЬ?

Сацыялагічныя даследаванні паказваюць, што тры з чатырох беларускіх жанчын пакутуюць ад хатняга гвалту, у тым ліку пабояў

Многія жанчыны гадамі церпяць прыніжэнні, таму што ім проста няма куды ісці. Чаму ахвяры аказваюцца такімі цярплівымі — асобная размова. Аднак уявім сабе, што аднойчы сітуацыя цалкам выйшла з-пад кантролю і гвалт аказаўся рэальнай пагрозай жыццю. Жанчына кідаецца на ўцёкі і... Куды ёй цяпер бегчы?

Чалавеку, які ўпершыню апынуўся ў выключна складанай сітуацыі, патрэбна дапамога. Ці хоць бы пэўны час — для разваг, для пошуку нумароў тэлефонаў... На дапамогу павінны прыйсці так званыя крызісныя прытулкі. Гэта могуць быць як звычайныя кватэры, так і проста невялікія пакойчыкі, у якіх ёсць усё неабходнае для перадышкі.

Засяліцца ў крызісны пакой можна па званку ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Спецыяліст запрашае прыехаць у цэнтр, адміністрацыя якога павінна заключыць з пацярпелай жанчынай (або мужчынам — іх жыццю таксама можа нехта пагражаць) дагавор на 10 дзён. Пры неабходнасці тэрмін могуць падоўжыць на некалькі месяцаў.

Пацярпеламу прапануецца пражыванне ў кватэры або пакоі, дзе ёсць спальнае месца, пасцельныя рэчы, мэбля, посуд, магчымасць для мыцця адзення і гатавання ежы. Гэта важна і зручна не толькі для дарослага, але і для яго дзяцей. Шасцёра малых у адным пакоі, вядома, не змесцяцца, таму для сям'і з двума дзецьмі ці большай іх колькасцю будуць шукаць сацыяльную кватэру. У невялікіх гарадах (кшталту Кобрына Брэсцкай вобласці) працуе толькі адзін крызісны пакой.

Пражыванне і дапамога спецыялістаў будуць бясплатнымі, аднак прадукты давядзецца набываць на ўласныя грошы. Калі ж у пацярпелага іх наогул няма, спецыялісты звяртаюцца ў дабрачынныя арганізацыі, да валанцёраў. У любым выпадку **чалавек атрымлівае не вырашэнне жыллёвага пытання з пражываннем на ўсім гатовым, а неабходную перадышку** для абмеркавання сваіх праблем са спецыяльнымі службамі — псіхалагічнай, юрыдычнай, медыцынскай.

— Калі жанчына трапляе ў крызісны пакой разам з дзецьмі, супрацоўнікі інфармуюць аб гэтым органы адукацыі і аховы здароўя, — кажа **дырэктар Кобрынскага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра Галіна ПАСЮК**. — Да вырашэння праблем сям'і падключаюцца ўстановы адукацыі, спецыялісты абароны дзяцінства. Здараецца, што сям'я трапляе пры гэтым на ўлік сацыяльна небяспечных.

Галоўным чынам размова ідзе ўсё ж пра неўладкаваныя сем'і, дзе ёсць шмат нявырашаных праблем і дапамагчы неабходна не толькі дарасламу, які страціў дах над галавой, але і няпоўнагадовым, прывязаным да гэтага дарослага. А звяртаюцца ў такія службы не толькі мясцовыя жыхары...

Не так даўно шукала паратунку нават жыхарка адной з далёкіх акруг Расіі. Збегла ад мужа ў Мінск, на вакзале распытала ў людзей, у які невялікі горад лепш паехаць, каб знайсці жыллё. Нехта параіў Кобрын, дзе бяглянку накіравалі ў крызісны пакой. Выканкам урэшце дазволіў грамадзянцы Расійскай Федэрацыі пражыванне. Каля месяца расіянка разам з дзіцем знаходзілася ў крызісным пакоі. Аднак пазней, паводле яе слоў, сваякі даслалі грошы, і з'явілася магчымасць зняць кватэру. Спецыялісты цэнтра прапаноўвалі ёй і навучанне на курсах у Брэсце, і праходжанне медагляду, і месца ў дзіцячым садку для дзіцяці... Аднак у нейкі момант бяглянка перастала адказваць на званкі. Паводле апошніх звестак, жанчына перабралася ў сталіцу і засялілася ў гасцініцу эканом-класа.

Святлана БАРЫСЕНКА

Куды звяніць?

Калі вы апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, а вам і вашым дзецям неабходны часовы прытулак, можна звярнуцца ў найбліжэйшы тэрытарыяльны цэнтр і даведацца, дзе працуе крызісны прытулак (звычайна гэта кватэра або пакой). Пры неабходнасці пацярпелага могуць размясціць у тым горадзе, што гатовы яго прыняць. Неабходную інфармацыю падкажуць і на агульнанацыянальнай «гарачай лініі»: 8 801 100 8 801 (званок са стацыянарнага тэлефона бясплатны). Можна звярнуцца і да ўчасткавага міліцыянера, які таксама дапаможа знайсці выйсце.

■ Сітуацыя

ШТО РОБІЦЬ «АРТЫЛЕРЫЯ» НА ТРАСЕ?

Адсутнасць пырскавікоў на легкавушках прыводзіць да значных праблем

Траса М1 — асноўная транзітная аўтамагістраль Беларусі працягласцю 611 км. Паўтара года яна з'яўляецца платнай для замежных удзельнікаў руху, што, здавалася б, павінна палепшыць яе стан. Але калі часам едзеш па гэтай трасе ў сталіцу на аўто, то ўзнікае адчуванне, што па машыне вядзецца артабстрэл. Часцей за ўсё праз гэта можна папсаваць лабавое шкло, фары, абшыўку. Вось і атрымліваецца, што пераезды становяцца даражэйшымі на кошт касметычнага рамонту аўто. Асабліва гэта тычыцца зімы. Вылучаюцца тры асноўныя праблемы: частая адсутнасць у легкавых аўтамабілях пырскавікоў, дэфармацыя дарогі і пясочная сумесь, якой пасыпаюць трасу.

КАМЕННЮ ТУТ НЕ МЕСЦА

Як патлумачыў **Сяргей ХОМІЧ, галоўны інжынер дарожна-эксплуатацыйнага ўпраўлення №5,** што тычыцца снегу, то рэжым яго прыборкі з магістралі М1 у зімовы перыяд кругласутачны і без выхадных. Адносна прыбірання смецця існуе спецыяльны рэгламент, які распрацаваны ў Мінтрансе.

«У зімовы перыяд мы збіраем смецце з аўтамагістралі прыкладна 2 разы на тыдзень, па прамым ходзе дарогі. На трасе яшчэ ёсць таксама аўтобусныя прыпынкі, пляцоўкі адпачынку — усё гэта прыбіраецца практычна 5 разоў на тыдзень», — расказаў Сяргей Хоміч.

Тады, калі траса прыбіраецца так часта, адкуль могуць з'явіцца камяні, што так і хочуць разбіць лабавое шкло? Падазрэнне падае на пясчана-солевую сумесь, якой пасыпаюць дарогу зімой. Але аказваецца, што справа не ў ёй.

«Пясчана-солевай сумессю яе цяпер не называюць. Згодна з дакументам СТБ 1158-2008 «Матэрыялы процігалалёдныя для зімовага ўтрымання аўтамабільных дарог» гэтую сумесь называюць ХФА 50. Дзе 50 — працэнт утрымання чыстага хларыду. Адпаведна астатнія 50% — гэта пясок першага класа (прасеяны пясок, дзе максімальная фракцыя пясчынкі да 5 мм). Камянёў там быць не павінна. Ды і ў нашых умовах надвор'я мы пясок не сыплем, а выкарыстоўваем толькі соль», — растлумачыў Сяргей Хоміч.

Як высветлілася, камяні на дарозе могуць быць цяпер толькі на ўчастках з павярхоўнай апрацоўкай. Пры такім надвор'і там можа адбыцца вылет друзу. Таксама на М1 утвараюцца ямкі, прычым самым непрадказальным спосабам — праз павелічэнне нагрузак, якія ствараюць велікагрузныя аўто. Калі гэта адбываецца, на дарозе можа з'явіцца друз дыяметрам 10 мм, што па норме з'яўляецца бяспечным. Падобныя ямкі прыбіраюць на працягу сутак з моманту выяўлення.

А КУЛІ СВІШЧУЦЬ...

Пад'язджаючы да Мінска, на адной з аўтазаправачных станцый разгаварыўся з кіроўцам, які ехаў таксама ў бок сталіцы. Аляксандр мне прадэманстраваў некалькі драпін, што атрымаў падчас свайго шляху гэтым жа днём.

«Людзі самі ствараюць небяспечныя сітуацыі, не маючы пырскавікоў на задніх колах. І такіх ездакоў сапраўды шмат. Тэхагляд жа можна прайсці і без пырскавікоў. А вось і наглядны прыклад на маім шкле, які пакінула «Такёта», што праязджала міма, адправіўшы ў мой бок камень», — прадэманстраваў аўтаўладальнік.

Калі машына імчыцца з хуткасцю 120 км/г, камень адскоквае з вялікай сілай і пры гэтым можа быць большым за дапушчальны дыяметр у 1 см. Таму грэбаваць пырскавікамі даволі небяспечна. Бо калі камень пакідае моцныя расколіны на лабавым шкле, то што ж будзе з чалавекам? Я паспрабаваў высветліць, ці ёсць людзі, якія пацярпелі такім чынам, але, як аказалася, канкрэтнай статыстыкі падобных траўмаў на М1 па Беларусі медыкі не вядуць. Аднак, што датычыцца праходжання тэхагляду, то ў адным са сталічных СТА растлумачылі: да пырскавікоў, калі іх няма, не чапляюцца. Выключэнне можа быць для тых легкавых аўто, у якіх яны прадугледжаны ў базавай камплектацыі абавязковага выкарыстання заводам-вытворцам, і да велікагрузаў. Адсюль і праблема ў наяўнасці. Застаецца толькі камянёў падсыпаць, што і робіць матухна прырода. А замена лабавога шкла можа вам абысціся ў суму ад 180 тысяч рублёў. Фара, не менш папулярная мішэнь для камянёў, што ляцяць з-пад колаў, будзе каштаваць ад 60 тысяч рублёў.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

Фота БЕЛТА.

ПАД ЛЬГОТЫ ТРАПІЎ І ЖЫЛЛЁВЫ ЛІЗІНГ

ПАДАТКІ НЕ ЧАПАЮЦЬ ЛІЗІНГАВЫЯ ГРОШЫ

Сёлета Падатковы кодэкс дапаўняецца і ў адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы № 99 ад 25 лютага 2014 года. Ён рэгулюе пытанні лізінгавай дзейнасці. Нагадаю, што з першых дзён гэтага года жыхары нашай краіны атрымалі права набываць жылыя памяшканні ў лізінг. Дык вось, сёлета людзі, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, будуць мець права на атрыманне маёмаснага падатковага выліку ў памеры ўсяго кошту гэтага жылога памяшкання, што набываецца ў лізінг. Ад сябе асабіста дадам, што льгота гэта сур'ёзная. Мой знаёмы, які будаваўся ў свой час, ужо тры гады падаткі з зарплаты не плаціць.

ПАВЯЛІЧЫЛІ ПАМЕР ПАДАТКОВЫХ ВЫЛІКАЎ

З пачатку года праіндэксаваны памер стандартнага выліку (гэта грошы, што падаткам не абкладаюцца), які даецца непасрэдна на работніка. Цяпер, калі яго заробак (даход) не перавышае 4 млн 420 тысяч рублёў у месяц, то падатковы вылік складзе 730 тысяч рублёў. Змяніўся стандартны вылік і на дзяцей. На адно дзіця (да 18 гадоў) ён складае 210 тысяч рублёў (раней было 180 тысяч рублёў). Для бацькоў, якія выхоўваюць дваіх і больш дзетак, а таксама для ўдоў, удаўцоў і адзінокіх бацькоў падатковы вылік на кожнага малога складае 410 тысяч рублёў (раней было 355 тысяч рублёў).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

З першых дзён года інвалідам 1-й і 2-й груп, героям Савецкага Саюза, удзельнікам і інвалідам Вялікай Айчыннай вайны і іншым катэгорыям грамадзян, якія маюць права на льготы ў адпаведнасці з законам «Аб ветэранах», павялічаны стандартны падатковы вылік з 890 тысяч рублёў да 1 млн 30 тысяч рублёў.

КАЛІ ПАЗЫКА РАЗГЛЯДАЕЦЦА ЯК ДАХОД

Часам падатковыя органы патрабуюць у грамадзян дэкларацыю аб даходах і маёмасці. Звычайна такая дэкларацыя запрошваецца ў чалавека ў тым выпадку, калі ў падатковых органаў узнікаюць падставы меркаваць, што гэты падаткаплацельшчык жыве, мякка кажучы, не зусім па сродках, бо ў яго расходы істотна перавышаюць афіцыйна атрыманыя даходы. Калі пры праверцы гэтай дэкларацыі будзе выяўлена, што на набыццё нейкай маёмасці выкарыстоўваліся пазычаныя сродкі і яны на момант праверкі не былі вернуты, то... Гэты **аб'ём пазычаных грашовых сродкаў лічыцца цяпер як даход грамадзяніна і абкладаецца падаходным падаткам у памеры 13%.**

Аплата такога падаходнага падатку ажыццяўляецца на падставе адпаведнага апавяшчэння падатковага органа. Святлана Шаўчэнка патлумачыла нам, што пазычаныя грошы могуць сёлета абкладацца падаткам і без адпаведнай праверкі дэкларацыі аб даходах і маёмасці фізічнай асобы. Гэта адбудзецца ў тым выпадку, калі грамадзянін заявіць аб пазычаных грашовых сродках не ў дэкларацыі, а ў тлумачэннях, дзе падаткаплацельшчык указвае, за кошт якіх фінансаў была набыта пэўная маёмасць (транспартныя сродкі, нерухомасць, гандлёвыя памяшканні і г. д.).

Цікава, якія пазычаныя сродкі ў гэтым выпадку абкладаюцца падаходным падаткам. Мне здаецца, што гэта не тычыцца звычайных крэдытаў ад айчынных банкаў. Святлана Шаўчэнка патлумачыла, што падаткаабкладаемай базай па вышэйназваным сцэнары будуць лічыцца пазыкі, што атрыманы ад любых фізічных асоб (за выключэннем блізкіх сваякоў і асоб, якія знаходзяцца ў адносінах сваяцтва), замежных прадпрымальнікаў і замежных арганізацый, якія не ажыццяўляюць дзейнасць на тэрыторыі Беларусі праз пастаянных прадстаўнікоў. Калі да апошніх дзён снежня пазыкі з падобных крыніц так і не былі вернуты, тады грамадзянін павінен самастойна наведаць падатковы орган да 2 сакавіка і па выніках 2014 года задэкларацца падобны даход і заплаціць падаходны падатак. Стаўка падаходнага падатку летась была на ўзроўні 12%, таму падобная невернутая пазыка абкладаецца падаткам гэтага ж памеру.

Гэта па мінулым годзе. Цяпер алгарытм падаткаабкладання па пазыках змяніўся і па выніках 2015 года такія даходы ўжо не трэба абавязкова дэкларацца ў 2016 годзе. Падобныя грашовыя пазыкі будуць абкладацца падаходным падаткам не ва ўсіх выпадках, а толькі тады, калі яны заяўлены грамадзянінам у якасці крыніцы даходу, за кошт якога набывалася дарагая маёмасць. І вядома, калі пазыка не была вернута.

ІНФАРМАЦЫЯ ПРА БАНКАЎСКУЮ ТАЯМНІЦУ

Святлана Шаўчэнка паведаміла, што **цяпер банкі абавязаны будуць даваць падатковым органам звесткі, якія трапляюць у ранг банкаўскай таямніцы**. Пералік падобнай інфармацыі будзе вызначаны Міністэрствам па падатках і зборах сумесна з Нацыянальным банкам. Потым менавіта па ім банкі і будуць супрацоўнічаць з падатковымі органамі. Спадарыня Шаўчэнка адзначыла, што сёння пералік гэтай інфармацыі пакуль не сфарміраваны. Разам з тым, ужо вядома, што інфармацыю пра грамадзян, якія набываюць вялікія аб'ёмы замежнай валюты, падатковыя органы будуць атрымліваць ад банкаў. Таму калі людзі, што не маюць сур'ёзных афіцыйных даходаў, пачнуць купляць буйныя сумы замежнай валюты, то яны абавязкова трапяць пад увагу падатковых органаў. Зразумела, што потым падатковая служба запатрабуе ад такіх шэрых прадпрымальнікаў запоўніць дэкларацыю аб даходах і маёмасці.

Сяргей КУРКАЧ.

■ Будзь у курсе!

ПЕРАВОЗКА ЖЫВЁЛ — У АСОБНЫМ КУПЭ,

а здаць білет на міжнародны цягнік пры спазненні цяпер можна толькі цягам гадзіны

Беларуская чыгунка праінфармавала пра змяненне тэрмінаў вяртання праязных дакументаў у міжнародных зносінах у выпадку спазнення пасажыра на цягнік, а таксама правіл перавозкі пакаёвых жывёл.

Так, з пачатку бягучага года ў выпадку спазнення пасажыра на цягнік міжнародных зносінаў вярнуць кошт праязнога дакумента (яго білетную частку) можна толькі цягам адной гадзіны пасля адпраўлення цягніка. Раней вяртаўся кошт білета, калі аб спазненні ў білетную касу было заяўлена цягам трох гадзін.

Таксама з 1 студзеня ўнесены змяненні ў правілы перавозкі пакаёвых жывёл. У міжнародных зносінах перавозка сабак, катоў, птушак дапускаецца толькі ў асобным купэ



купэйнага вагона — не больш за дзве жывёлы. Пры гэтым пасажыру неабходна заплаціць за перавозку жывёлы па поўным тарыфе па колькасці незанятых месцаў у купэ. Пры адсутнасці ў перавозчыка магчымасці прапанаваць асобнае купэ для перавозкі жывёл такая перавозка не дапускаецца.

Пакаёвыя жывёлы павінны быць у скрыні, кошыку, клетцы і свабодна размяшчацца на месцах, адведзеных для перавозкі ручной паклажы. Сабакі, не змешчаныя ў спецыяльную тару, павінны мець намордник і павадок. Пасажыр нясе поўную адказнасць за парушэнне санітарна-гігіенічных патрабаванняў жывёламі, якіх ён перавозіць, і абавязаны забяспечыць адпаведную ўборку вагонаў.

Невідушчым пасажырам дазваляецца правозіць з сабой сабак-павадыроў у агульных і плацкартных вагонах без дадатковай аплаты. Пры правозе сабак-павадыроў у адным купэ купэйнага вагона пасажыр абавязаны аплаціць паездку па поўным тарыфе па колькасці незанятых месцаў у купэ.

Як зазначылі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, вышэйназваныя змяненні ўведзены ў дзеянне ў адпаведнасці з новай рэдакцыяй дадатку «Пагадненне аб міжнародных пасажырскіх зносінах з улікам асаблівасцяў прымянення яго асобных норм у дзяржавах — удзельніцах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, Грузіі, Латвійскай Рэспублікі, Літоўскай Рэспублікі, Эстонскай Рэспублікі». Новая рэдакцыя была прынятая на 61-м пасяджэнні Савета па чыгуначным транспарце дзяржаў — удзельніц Садружнасці, якое праходзіла ў кастрычніку мінулага года ў Баку.

Сяргей РАСОЛЬКА

ЗАПРАШАЕМ
РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ
Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»
Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52.
E-mail: reklama@zviazda.by.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона)
по поручению ОАО «Гроднорайагросервис» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион
по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества,
расположенных на земельном участке пл. 8,6869 га, по адресу:**

Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с, д. Котра, ул. Молодежная, 2,

в составе:

Площадка на 50 автомашин (проезд), **инв. № 401/С-22130**, общ. пл. покрытия **7485 кв.м**
Открытая стоянка тракторов (проезд), **инв. № 401/С-22131**, общ. пл. покрытия **6919 кв.м**
Подъездные пути (проезд), **инв. № 401/С-22132,** общ. пл. покрытия **5319 кв.м**
СТО на 100 автомобилей, **инв. № 401/С-11650**, общ. пл. **1682,9 кв.м**;
Столярный цех, **инв. № 401/С-11656**, общ. пл. **1006,8 кв.м;**
Мастерские, **инв. № 401/С-11654**, общ. пл. **991,2 кв.м;**
Склад, **инв. № 401/С-11651**, общ. пл. **636,7 кв.м;**
Здание гостиницы, **инв. № 401/С-9639**, общ. пл. **661,3 кв.м;**
Здание административно-хозяйственное, **инв. № 401/С-11655**, общ. пл. **482,3 кв.м**;
Кафе-бар, **инв. № 401/С-9640**, общ. пл. **374,1 кв.м**;
Диспетчерская, **инв. № 401/С-11653**, общ. пл. **57,7 кв.м;**
Проходная, **инв. № 401/С-11652**, общ. пл. **131,3 кв.м;**
Автозаправочная, **инв. № 401/С-18230**, общ. пл. **12,5 кв.м**;
Трансформаторная подстанция, **инв. № 401/С-11657**, общ. пл. **40,6 кв.м**;
Сооружения благоустройства, **инв. № 401/С-22133;**
Канализационная сеть (ливневая), **инв. № 401/С-22050, протяженность 183 м;**
Канализационная сеть (фекальная), **инв. № 401/С-22049**, **протяженность 320,8 м;**
Тепловая сеть, **инв. № 401/С-22052, протяженность 58 м;**
в т.ч. оборудование: кран-балка 3т, инв. № 5016 (бух учет); кран-балка подвесная, инв. № 1856 (бух учет); ТРК Квантум-500, инв. № 9990397 (бух. учет); ТРК Квантум – 500, инв. № 9990396 (бух. учет).
В технические паспорта капитальных строений в качестве составных частей и принадлежностей внесены отдельные сооружения благоустройства, элементы инженерных сетей.

Начальная цена с НДС – 17 461 316 143 бел. руб.

Земельный участок пл. 8,6869 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий, с установленным ограничением – водоохранная зона водных объектов (пл. 7,8135 га).
Задаток 5% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска, ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона.
Условия реализации объекта – вовлечение в хозяйственный оборот в течение трех лет с момента заключения договора купли-продажи.
Условия оплаты: если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 26.11.2014 г.
Аукцион состоится **21.01.2015 в 14.00** по адресу: г. Гродно, ул. Понемуньская, 27, ОАО «Гроднорайагросервис».
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.01.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 10.02.2015 г. в 10.30

по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 4 этаж, актовый зал.

Организатором аукциона является

РУП «Белпочта»

в лице Гродненского филиала РУП «Белпочта»,
находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

ЛОТ № 1. Помещения на 2 этаже общей площадью 25,5 (15,7; 9,8), расположенные по адресу: Гродненская обл., г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29, пом. 5, изолированное помещение, помещение связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 650 250 рублей, размер задатка – 65 025 рублей, целевое использование – размещение офисов, организации производств (кроме вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения.

ЛОТ № 2. Помещение на 1 этаже площадью 11,4 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, г. Лида, ул. Рыбиновского, д. 24, капитальное строение, здание отделения связи № 12, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 290 700 рублей, размер задатка – 29 070 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств).

Арендная плата устанавливается в соответствии с Положением о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 года № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» (далее – Положение). При установлении коэффициента от 0,5 до 3 включительно, определенного п. 8.2 Положения, при расчете арендной платы применяется коэффициент в размере 3.

Документы на участие в аукционе принимаются с 12.01.2015 г. по 06.02.2015 г. в рабочее время (с 8.30 до 17.30) по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 3 этаж, каб. 302. Документы, поданные после 16.00 06.02.2015 г., не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:

- перечисляет задаток на субсчет № 3012000060006 в филиале № 400 ГОУ АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, код 752, УНП 500826554, Гродненский филиал РУП «Белпочта»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации, документ, удостоверяющий личность;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

В случаях, если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол о результатах аукциона; не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона; не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона; не подписал договор аренды, а также, в случае если участники аукциона, отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин.

Договор аренды по результатам проведения аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Телефон для справок: (8-0152) 74-61-47, факс (8-0152) 72-31-23.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона)
по поручению ОАО «Брестоблресурсы» (продавец)
проводит повторный открытый аукцион по продаже одним лотом
объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу:**

Брестская обл., г. Брест, ул. Катин Бор, д. 107

в составе:

- **здание склада химикатов,** общ. пл. **1413,3 кв.м,** инвентарный номер 100/С-46017.
- **здание административно-бытового корпуса**, общ. пл. **1036,4 кв.м**, инвентарный номер 100/С-48110, в том числе покрытие из асфальтобетона, пл. 5901 м.кв., площадка для хранения вторсырья, пл. 519 м.кв., площадка для легкового автомобильного транспорта, пл. 29 м.кв., покрытие из тротуарной плитки, пл.118,2 м.кв., покрытие из бетона, пл. 51,7 м.кв., покрытие из тротуарной плитки, пл. 8,2 м.кв., покрытие из железобетонной плитки, пл. 5,5 м.кв., ограждение из железобетонных плит, пл. 127,4 м.кв., ограждение из железобетонных плит, пл. 35,2 м.кв., ограждение из металлической сетки, пл. 260,1 м.кв., ворота, пл. 9,0 м.кв., водопроводная сеть протяженностью 886,0 м, канализационная сеть протяженностью 305,1 м, наружные сети освещения протяженностью 255,6 м, наружные сети освещения протяженностью 131,6 м, ливневая канализационная сеть, протяженностью 283,2 м, ливневая канализационная сеть протяженностью 131,0 м.
- **здание КПП**, общ. пл. **12,8 кв.м**, инвентарный номер 100/С-61838.
- **здание автовесов**, общ. пл. **81 кв.м,** инвентарный номер 100/С-46014.
- **котел** стальной твердотопливный бытовой КСТБ-95, 2012 г.в. (инв. № 0011246).
- **котел** стальной твердотопливный бытовой КСТБ-95, 2012 г.в. (инв. № 0011247).

Начальная цена лота с НДС (20%) – 10 116 398 640 бел. руб.

Объекты недвижимости расположены на земельном участке пл. **1,3956 га**, предоставленным продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания базы. Помещения здания склада химикатов и административно-бытового корпуса частично сдаются в аренду. Арендуемая площадь по состоянию на 01.06.2014 г. – 940,6 кв.м.
Общая сумма арендной платы в месяц 44 975 880 бел. руб.
Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска, ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение десяти рабочих дней после проведения аукциона.
Условия оплаты за объект: 50% от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня заключения договора купли продажи, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно равными долями в течение 6 месяцев, начиная с месяца, следующего за месяцем, в котором должен осуществляться первоначальный платеж в соответствии с договором купли-продажи.
Ежемесячные платежи рассрочки, указанные в договоре купли-продажи, индексируются исходя из индекса цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения, которые рассчитываются и публикуются Национальным статистическим комитетом Республики Беларусь. Ежемесячный платеж осуществляется в течение пяти рабочих дней со дня опубликования индексов цен производителей промышленной продукции производственно-технического назначения.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Оплата вознаграждения за организацию и проведение торгов, а также суммы фактических затрат на его проведение осуществляется победителем торгов (покупателем), в порядке, предусмотренным соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (Приложение № 3 к Условиям проведения аукциона от 05.06.2014 г.).
Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.11.2014 г.
Дата, время и место проведения аукциона: 12.02.2015 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 4, ГО «Белресурсы» – управляющая компания холдинга «Белресурсы», 3-й этаж, актовый зал.
Срок окончания приема документов для участия в аукционе: заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.02.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».

**Тел.: +375 17-280-36-37; 8029-183-69-71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона)
по поручению ОАО «Оршанский инструментальный завод» (продавец)
проводит открытый аукцион**

по продаже здания склада,

**инвентарный номер 240/С-28602, общей площадью 310,5 кв.м,
расположенного по адресу:**

Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 39Ж,

в том числе: металлическая пристройка к зданию склада площадью 80 кв.м, асфальтобетонная площадка 170 кв.м, ограждение пром. площадки площадью 37 кв.м

Начальная цена с НДС – 537 490 800 бел. руб.

Земельный участок пл. 0,0591 га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания склада, с установленными ограничениями – охранная зона сетей теплоснабжения, площадь 0,0019 га и охранная зона сетей канализации, площадь 0,0089 га.
Задаток 10% от начальной цены лота перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска, ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».
Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **15** (пятнадцати) рабочих дней после проведения аукциона.
Условия оплаты: если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**
Аукцион состоится **13.02.2015 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **11.02.2015 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.
www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение

«Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ ОБ ОТМЕНЕ ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса–пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану». Продовольственный магазин (5 пусковой комплекс) в г. Минске,
опубликованную в газете «Звязда» 01 июня 2013 года.

Генеральный директор *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

Свидетельство о государственной регистрации ИП Чернецкого А.К. УНП 190015621 **считать недействительным в связи с утерей.**

Считать недействительным страховой полис филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу, формы 2РН 2РП серия БМ № 0803907. УНП 100706519

ОАО «Амкодор-КЭЗ»

Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово,
Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества

Извещение о созыве внеочередного общего собрания акционеров

**Собрание состоится 22 января 2015 г. в 14.00
по адресу: Витебская обл., Толочинский район, г.п. Коханово,
Промышленная зона, ул. Промышленная, 3, зал заседаний Общества.**
Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания **с 13.00 до 13.55.**
Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, — **15 января 2015 года.**

Повестка дня:

1. Об утверждении результатов закрытой подписки на акции Общества.
2. Об утверждении решения о выпуске акций Общества.
3. Об увеличении уставного фонда Общества.
4. О внесении изменений и дополнений в устав Общества.

Основание созыва собрания — решение Совета директоров Общества от 8 января 2015 года.
С информацией (материалами), подлежащими представлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 15 января 2015 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.
Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность или договор).

УНП 300028841 *Совет директоров ОАО «Амкодор-КЭЗ»*

белагропромбанк
традиции будущего

ДОГОВОР СРОЧНОГО БАНКОВСКОГО ВКЛАДА (ДЕПОЗИТА) «ИНДЕКСИРУЕМЫЙ 2.0» №

г. _____ «___» _____20__ г.

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» (ОАО «Белагропромбанк»), именуемое в дальнейшем «Вкладополучатель», в лице _____, действующего на основании _____, с одной стороны, и _____, именуемый в дальнейшем «Вкладчик» с другой стороны, далее совместно именуемые «Стороны», заключили настоящий договор о нижеследующем.

1. Вкладчик вносит наличными или перечисляет безналичным путем денежные средства в белорусских рублях на вкладной (депозитный) счет №3414_____ / _____ в день заключения настоящего договора, а Вкладополучатель принимает их, обязуется обеспечить их сохранность и возвратить наличными денежными средствами, либо безналичным путем (по усмотрению Вкладчика) сумму вклада (депозита) и начисленные проценты в порядке и на условиях, предусмотренных настоящим договором.
Мабыць, былі падставы прылічыць М.В. Зімяніна да скрытых абаронцаў так званай «Рускай партыі» ў Мікалая Мітрохіна, аўтара кнігі «Руская партыя. Рух рускіх нацыяналістаў у СССР. 1953—1985 гады». Думаецца, што назву «Руская партыя», як і паняцце «русісты», гісторыю з царскім сервізам на вяселлі дачкі Рыгора Раманава, з залатым прысцёнкам Брэжнева, з незлічонымі дыяментамі яго дачкі і многія іншыя сюжэты, што выклікаюць праведны грамадзянскі гнеў, стварылі путаніны гнязда Андропава з Пятага «ідэалагічнага» ўпраўлення КДБ СССР.

Для іх таямнічая «Руская партыя» была вельмі зручным і ёмістым кошыкам, куды звальваліся без разбору ўсе патрыятычна настроеныя групы або асобныя людзі.

У 1970-я гады ў ЦК КПСС літаральна хлынуў паток лістоў, у якіх удзельнікі падполля і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны скардзіліся на несправядлівае да іх стаўленне ўлад, якія не прызнавалі іх заслуг у барацьбе з фашысцкімі акупантамі. Асабліва шмат скаргаў прыходзіла з Украіны. Імёны многіх падпольшчыкаў па меркаваннях канспірацыі не заносіліся ў партызанскія спісы, і гэта служыла падставай для адмовы ў выдачы ветэранскіх пасведчанняў.

На працягу трох дзён прадстаўнікі партыйных органаў Украіны, Беларусі, шэрагу абласцей Расіі, а таксама ваенныя і чэкісты абмяркоўвалі гэтую праблему. На нарадзе, скліканай па ініцыятыве Зімяніна, было вырашана: калі ўдзел у партызанскіх аперацыях і ў падполлі пацвярджаецца сведкамі, удзельнік атрымлівае адпаведныя дакументы. Зімянін прапанаваў прыраўняць падпольшчыкаў да партызанаў. Гэтага не было зроблена, нягледзячы на шматлікія звароты, ні пры Сталіне, ні пры Хрушчове. А барацьба ў падполлі была не менш рызыкоўнай, чым бітвы ў партызанскіх атрадах, і часта заканчвалася гібеллю падпольшчыкаў у фашысцкіх засценках.

Першапачаткова Міхаіл Суслаў успрыняў гэтую прапанову з сумненнем: «Міша, а не атрымаем мы ў выніку тысяч сто ліпавых партызанаў?».

— Выключыць такую верагоднасць нельга, затое мільёны, нарэшце, адчуюць справядлівае да сябе стаўленне. Ім будзе чым ганарыцца, будзе што расказаць унукам, — адказаў Зімянін.

Да гонару Суслава, ён вагаўся нядоўга. Далажыў Брэжневу, а той адразу даў згоду.

За два гады напружанай працы партыйцаў, ваенных, чэкістаў колькасць удзельнікаў партызанскага руху ва Украіне павялічылася на мільён і склала паўтара мільёна чалавек. Да радасці сваёй атрымалі пасведчанні сотні тысяч змагароў з фашызмам у Расіі і шматпакутнай Беларусі, якая страціла ў вайне больш за тры з паловай мільёны сваіх грамадзян, кожнага трэцяга...

Бацька быў шчаслівы, калі яго запрасілі ўдзельнічаць у падрыхтоўцы зборніка «Жывая памяць», прысвечанага пяцідзесяцігоддзю Вялікай Перамогі. Артыкул Зімяніна як аднаго з арганізатараў партызанскага руху адкрываў раздзел дакументальных сведчанняў пра ўсенародную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ён паспеў убачыць сваю працу надрукаванай.

Асабліва востра ўсведамляючы хуткачасць адведзенага яму часу, Міхаіл Васільевіч Зімянін спяшаўся выказаць на паперы самае важнае з таго, што ён, пакутуючы начамі ад разважанняў, якія перапаўнялі яго, цвёрда вызначыў для сябе ў канцы жыцця:

«Я шмат у чым грэшны. Шмат чаго не зрабіў. Шмат пра што не думаў. Шмат у чым памыляўся. Дапусціў шмат памылак. Суцяшае толькі тое, што заўсёды стараўся сумленна служыць Радзіме. З гэтым і памру!

Люблю маё пакаленне, некалі магутнае, а цяпер яно нагадвае высечаны лес. Нам выпаў гонар працаваць і змагацца на працягу большай часткі адыходзячага дваццатага стагоддзя, па маім разуменні, аднаго з самых супярэчлівых перыядаў у жыцці ўсяго чалавецтва».

Такі апошні запіс у бацькавым дзённіку.

(Заканчэнне. Пачатак ў нумары за 6 студзеня.)

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 1 (258)

■ Блізкае святло

Асаблівыя, асобныя, асобы...

Як, ствараючы ад сябе, можна ствараць Беларусь

Творчасць калі ёсць, то яна ёсць — і чалавеку ад яе нікуды не падзецца. Ён будзе сыпаць творчымі іскрынкамі, нават калі яму выпадзе змяніць прафесію, знайсці нейкія іншыя кірункі і сферы. Ці можна навучыць творчасці? Кажуць, гэтая іскра альбо ёсць, альбо яе няма. Але ў Інстытуце журналістыкі БДУ могуць паспрачацца: для таго, каб гэтыя іскрынкі не згаслі, а наадварот, акумулявалі святло, іх трэба распаліць, скіраваць, зарадзіць энергіяй. І тады асобны чалавек, студэнт, творчая адзінка становіцца асобай у творчасці. Такіх асоб — якія сцвердзіліся ў самых розных відах мастацтва Беларусі — журфак выхаваў шмат. Некаторыя з іх сталі героямі кнігі «Святло блізкіх зорак», якая ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Усяго ў зборніку прадстаўлены 23 творчыя партрэты вядомых асоб — журналістаў, пісьменнікаў і паэтаў, кінарэжысёраў, навукоўцаў, крытыкаў. Усіх іх аб'ядноўвае журфак (цяпер Інстытут журналістыкі БДУ), які напрыканцы 2014 года адзначыў 70-годдзе.

Укладальніца, загадчыца кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта Людміла САЯНКОВА, адзначыла:

— На факультэце журналістыкі склалася даўняя традыцыя — яшчэ, напэўна, з моманту заснавання (з 1944 года): тут выкладалі цудоўныя спецыялісты, якія давалі веды па розных прадметах — па літаратуры, мастацтве, культуры, натхнялі на творчасць. І сярод студэнтаў былі тыя, хто заўсёды гэтым цікавіўся, у кім творчасць асабліва адгукалася. Гэта ўнікальныя людзі, якія рабілі сваю справу. Але яны зрабілі свой унёсак у нацыянальную культуру Беларусі. Не толькі цудоўныя журналісты, але пісьменнікі, празаікі і паэты, кінарэжысёры, крытыкі ў розных відах мастацтва. Сярод герояў кнігі — адзін з выдатных паэтаў Беларусі, студэнт першага выпуску Мікола Аўрамчык, паэты Васіль Зуёнак, Янка Сіпакоў, Генадзь Бураўкін, пісьменнікі Іван Чыгрынаў, Міхась Стральцоў, Барыс Сачанка, Павел Місько, Святлана Алексіевіч, кінарэжысёры Ігар Дабралюбаў, Анатоль Алай, прафесар Адам Мальдзіс і іншыя. Я лічу, што гэтая кніга — толькі пачатак, таму што аўтараў, якія ўнеслі свой уклад у развіццё нацыянальнай культуры нашай краіны, значна больш. Таму ў яе можа быць працяг.

Аўтары, якія пісалі пра творцаў, таксама розныя — навукоўцы, выкладчыкі, даследчыкі творчасці, добрыя знаёмыя, сваякі і дзеці герояў, дзякуючы чаму кніга прасякнута цеплынёй. Ці проста пісаць пра блізкіх? Дачка Івана Чыгрынава Таццяна Прановіч, напрыклад, звярнулася да студэнтаў са словамі:

— Калі перада мной узнікла задача напісаць пра бацьку, я схамянулася, таму што зразумела, што гэта вельмі цяжка. Было б прасцей, калі б на працягу ўсяго жыцця нешта запісвалася, занатоўвалася, пазначалася. Памяць чалавечая недасканала. Але мне ў жыцці пашчасціла. Я бачыла і ведала шмат вядомых людзей з маленства. Аднойчы бачыла як Генадзь Бураўкін і Рыгор Барадулін танцавалі шэйк, гэта было ў 60-я гады, на сустрэчы ў нашай кватэры, куды мы толькі пераехалі. Гэта цудоўна, калі ёсць асабліва творчае асяроддзе. У майго бацькі гэтае асяроддзе было, і ў мяне яно было. За гэта таксама вялікі дзякуй і бацьку, і лёсу. Можа і сярод сённяшніх студэнтаў ужо нарадзіліся будучыя зоркі, таму трэба быць уважлівымі адзін да аднаго, лавіць цікавыя моманты, у якіх праяўляюцца характары і асобы.

Галіна Багданава, дачка яшчэ аднаго героя кнігі «Святло блізкіх зорак», пісьменніка Барыса Сачанкі, падкрэсліла вартасць урокаў бацькавых і ўрокаў, якія дае прафесія журналіста: як дзеля аднаго слова трэба ўмець пераварочваць «руду», так і можна навучыцца крышталізаваць светапогляд чалавечы, які можа паўплываць на жыццё краіны. Гэта здольнасць ёсць і ў журналістыкі, і ў мастацтва.

Таму і значэнне зборніка не толькі ў тым, каб прадставіць творчыя партрэты славутых выпускнікоў, але гэта яшчэ і выхаванне прыкладамі. Асобы ў творчасці часта сцвярджаліся насуперак абставінам, яны ўмелі быць моцнымі і адстойваць сваю думку, пазіцыю нават за савецкім часам, калі гэта здавалася немагчымым. Яны (здаецца) умелі зварочваць горы.

Дырэктар Інстытута журналістыкі БДУ Сяргей ДУБОВІК падкрэсліў:

— У нас шмат выпускнікоў, якімі ганарыцца краіна. Мы памятаем усіх, хто калісьці тут вучыўся: гэта той падмурак, на якім трымаецца Інстытут журналістыкі БДУ ўжо 70 гадоў — у нас амаль 8000 выпускнікоў. Наша задача — выхоўваць студэнтаў і на прыкладзе тых, хто сцвердзіўся ў творчасці.

Найперш іх імёны трэба ведаць. Ведаць, што яны стваралі. Стваралі кожны за сябе, але атрымалася, што стваралі культуру Беларусі.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Шануй сваё

ПА КІМ ЗВОНЯЦЬ ЗВАНЫ-ЦЫМБАЛЫ?

Бываюць канцэрты і бываюць Канцэрты... Мы шукаем музыку — кожны адпаведна свайму настрою ў канкрэтны момант. А бывае, што проста натыкаемся на тое, што прапаноўваецца кімсьці звонку — назойліва, штучна. І душа не прымае. Можна з ёю, вядома, дамовіцца, дасягнуць кампрамісу, прыстасавацца да вонкавых гукаў. І калі ўжо дамовіўся і прыстасаваўся (так здаецца), раптам можаш натрапіць на нечаканасць і здзіўленне, калі загучыць нешта вельмі знаёмае, здаецца, простае, але тое, што трапляе ў рэзананс. З табой. З вонкавым атачэннем. З прыродай, надвор'ем і безліччу дробязяў, якія не залежаць ад цябе канкрэтна і вызначаюць тое, што называецца асяродак. І хочаш ці не, але ў кожнай мясцовасці (так сталася) і асяродку ёсць свае гукі, свае галасы, свае мелодыі. І дадзены інструменты, каб іх агучыць.

У Беларусі ёсць цудоўны голас. Не, цэлы хор — таму што нашы цымбалы адначасова могуць выдаць непаўторнае сугучча, нібыта гэта хор з некалькіх званоў. І гэтую дзівосную пранікнёнасць, імклівасць, а часам і цішыню (але адлюстраваную ў гуках) ствараюць цымбалы і людзі, якія на іх іграюць. Каб скласці праграму канцэртаў, дзе асноўны голас — цымбальны, трэба добра ведаць свайго слухача і разумець, у якіх умовах ён існуе. Што ён любіць, і чаму прыйшоў слухаць гэтую музыку. Якую, напрыклад, іграе Нацыянальны акадэмічны аркестр беларускіх народных інструментаў імя Іосіфа Жыновіча. З яго кіраўніком прафесарам Міхаілам Казінцом мы разважаем пра цымбалы як беларускі цуд.

ГУЧАННЕ

— Кожны народ мае свой музычны інструмент, уласцівую яму брэндавую народную песню, — гаворыць **народны артыст Беларусі Міхаіл КАЗІНЕЦ**. — Інструментальны голас Беларусі — цымбалы. Цымбалы ёсць у Малдове, Румыніі, Венгрыі, ва Украіне, але яны таксама розныя, як і розныя песні ў гэтых народаў. Беларусі пашчасціла, што ў свой час у яе з'явіўся чалавек, які ўвасобіў музыку цымбал Беларусі. У 1924 годзе Іосіф Жыновіч прыйшоў маладым чалавекам у БДТ-1 (цяпер Купалаўскі тэатр) і на цымбалах суправаджаў «Паўлінку». Але яшчэ больш цудоўна, што гэтага самародка пачулі. Гэта вялікі чалавек не толькі таму, што ён быў віртуозам беларускіх цымбал (і застаецца дагэтуль), а ў тым, што ён яшчэ і асветнік. Ён фактычна стварыў беларускую школу ігры на цымбалах. Калі ёсць школа, то значыць, ёсць той падмурак, на якім можна нешта будаваць. Ён не толькі вывеў цымбалы з побытавага, вясковага, часам наіўнага і простага акампанементу народнай песні на канцэртную эстраду, але дзякуючы яму гэты інструмент займеў сваю нішу ў вялікай супольнасці сольных інструментаў.

Іосіф Жыновіч аказаўся яшчэ і геніяльным педагогам, прафесарам, які перадаваў майстэрства іншым. Я наогул лічу, што ёсць тры асобы ў Беларусі — Шырма, Жыновіч і Цітовіч, — якія ў свой час стварылі прафесійную аснову беларускай песні і беларускага інструментальнага голасу. Заслуга Жыновіча ў тым, што ён змог на ўсіх узроўнях даказаць неабходнасць вывучэння цымбал як цудоўнага канцэртнага інструмента: музычная школа як першае звяно, музычнае вучылішча (каледж, ліцэй) як сярэдняе, і далей — кансерваторыя ці Акадэмія музыкі. Дзякуючы Жыновічу склалася цымбальная школа Беларусі, якую сёння ўвасабляюць яго вучні Таццяна Сергіенка і Яўген Гладкоў. Яны ўдасканалілі школу ігры на цымбалах, выхавалі і выхоўваюць бліскучых музыкантаў, якімі наша краіна можа ганарыцца.

ІМКНЕННЕ

— Склад Нацыянальнага акадэмічнага аркестра народных інструментаў імя Жыновіча на сённяшні дзень — гэта выхаванцы беларускай кансерваторыі (Акадэміі музыкі), творчыя праўнукі Іосіфа Жыновіча. Мы традыцыі вельмі шануем, таму што яны важныя ў выхаванні музыканта. Я магу пагадзіцца, што Беларусь наогул не ўмее ганарыцца тым, што мае. Пакуль беларускую песню не заспявалі «Песняры», людзі не адчувалі прыгажосці і велічы сваёй песні. Але яна сама па сабе геніяльная, таму што ў ёй сутнасць і душа народа. Душа гэтая гучыць і праз цымбалы, вельмі гучна: мы маем бліскучых выканаўцаў, лаўрэатаў міжнародных конкурсаў, сапраўды «віртуозаў цымбал». Калі беларускія цымбалісты едуць на міжнародныя конкурсы, дзе выступаюць разам з выканаўцамі на рускіх балалайках, домрах і іншых нацыянальных інструментах, то, як правіла, гран-пры і першыя месцы атрымліваюць выканаўцы на беларускіх цымбалах. Але ў той жа час я не сказаў бы, што ў Беларусі гэты інструмент вельмі звыклы для вуха айчыннага слухача. Я гэта магу патлумачыць некаторым касмапалітызмам, які застаўся з часоў Савецкага Саюза, калі вельмі прасоўвалася ідэя інтэрнацыяналізму, часта за кошт павагі да сваёй культуры. Трэба сябраваць, вядома, і паважаць сяброў, але быў дзіўны падыход, што беларуская музыка ў кансерваторыі вывучалася шмат гадоў як музыка народаў СССР. Глыбока вывучалася музыка руская, заходняя класіка, музыка народаў СССР і ў рамках яе трошкі беларускай музыкі. Гэта адбілася на людзях, якія вучыліся музыцы: свая родная не стала блізкай і не так шырока гучала ў рэспубліцы. У свой час ствараліся цудоўныя аркестры рускіх народных інструментаў, дзе асновай былі домра і балалайка, у музычных навучальных установах. Нават калі я вучыўся ў кансерваторыі, то аркестра беларускіх народных інструментаў там не было, а быў аркестр рускіх народных інструментаў. Але дзякуй Богу, што я сам з вёскі, то ведаў, што значыць музыка Беларусі, і якія ў яе інструменты. У свой час удзельнічаў у традыцыйных вяселлях (быў гарманістам з 8 гадоў), і заўсёды побач са мной знаходзіўся цымбаліст. У нас была такая музыка: бубен, цымбалы і гармонік. Цымбалы з малых гадоў для майго вуха былі натуральныя.

Цяпер цымбалы — інструмент прафесійнага майстэрства. Пачатак гэтаму заклаў аркестр беларускіх народных інструментаў, які вырас з ансамбля цымбалістаў. А ў 1938 годзе гэта ўжо быў дзяржаўны аркестр. Але ён доўга быў адзін на ўсю краіну. Апошнія 25-30 гадоў існуе яшчэ аркестр беларускіх народных інструментаў пры Акадэміі музыкі. Аркестраў беларускіх народных інструментаў мала ў сярэдніх навучальных установах нашай краіны. Мы ўсё яшчэ ставімся да гэтых інструментаў, нібыта да прыёмных дзяцей, не народжаных тут. У многім вінавата, лічу, тое, што ў свой час пры гарадскіх дамах культуры, заводскіх клубах перавагу аддавалі аркестрам рускіх народных інструментаў. Мне здаецца, павінны прыйсці пакаленні людзей з іншай свядомасцю, з любоўю да радзімы, якая праяўляецца і праз музыку.

12 студзеня Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Рэспублікі Беларусі імя Жыновіча прэзентуе праграму ў дзень нараджэння Уладзіміра Мулявіна і ў яго гонар. Разам з аркестрам выступіць саліст Пётр Ялфімаў, які выканае песні са спадчыны «Песняроў». Прагучаць і творы на словы Янкі Купалы — урывак з рок-араторыі «Гусляр», а таксама кампазіцыя «Я не паэта», якая дала назву ўсёй вечарыне.

СТВАРЭННЕ

— Безумоўна, гэта залежыць ад рэпертуару. Таму што ў асноўным навучанне на цымбалах ідзе па скрыпічным рэпертуары. Тыя творы, якія пішуцца ў арыгінале для цымбалаў, нясуць у сабе акадэмічны, класічны характар. Яны не заўсёды зразумелыя шырокаму слухачу, хоць бліскуча гучаць на цымбалах. Заўсёды ёсць пытанне стварэння рэпертуару канцэртных праграм: каб слухач не стамляўся, але і каб не спрашчаць яго густ. Гісторыя музыкі ведае: лепшае, што створана ў гэтым відзе мастацтва — музыка заказная. Сёння я не магу заказаць твор кампазітару, таму што за яго трэба плаціць. А калі твор няўдалы? Фактычна, калі з 10 твораў, якія мы сыгралі, адзін застаецца ў рэпертуары на гады — гэта вялікая ўдача. А бывае так, што рэпецируем удала, а на публіцы не ідзе.

Памятаю, я прыйшоў у аркестр у 1972 годзе, а з сярэдзіны 70-х і ў 90-я быў «залаты час», калі Андрэй Мдзівані стварыў каля 20 твораў для аркестра на беларускім матэрыяле. Цудоўна працаваў Валерый Іваноў, Віктар Помазаў, які падкрэсліў аўтэнтычнасць — напісаў сюіту «Батлейка» для аркестра. Я з настальгіяй узгадваю той час у плане стаўлення да аркестра Жыновіча. Усякая праграма, якая ішла на сцэне Белдзяржфілармоніі, потым праходзіла па тэлебачанні, і па радыё кожны ранак гучаў аркестр.

Цяпер «папсовы век» і, на жаль, вуха слухача прывыкла да іншага кшталту музыкі — квадратнай, простай, з вельмі непатрабавальнай паэтыкай слова. І мы павінны выжываць у гэтай сітуацыі. Таму вымушаны і эксперыментаваць, каб здзіўляць. І ёсць з чым: нават беларускія народныя мелодыі на цымбалах у выкананні некаторых музыкантаў могуць гучаць абсалютна нечакана, віртуозна, як, напрыклад, Міхаіл Лявончык умее інтэрпрэтаваць іх у джазавай манеры. Музыку трэба слухаць, каб яе палюбіць. І тады ў ёй можа адкрыцца безліч цудаў.

Прывяду прыклад: летась у лістападзе я ўзначальваў маладзёжны сімфанічны аркестр чатырох краін: Бельгіі, Германіі, Францыі, Люксембурга. Са мной у канцэртах удзельнічала Аляксандра Дзенісеня, якая дагэтуль цудоўна выступіла ў класічным «Еўрабачанні». У канцэрце гучаў Хіндэльмінт, Шуман, Рымскі-Корсакаў і канцэрт Уладзіміра Кур'яна для цымбалаў з аркестрам. Гэта была «бомба» ў канцэрце. Калі Саша іграла, для саміх музыкантаў чатырох краін гэта было адкрыццё дзіўнага для іх інструмента. І сам канцэрт — даступны мадэрн, кампазітар настолькі цудоўна адчуў прыроду цымбалаў і іх магчымасці, прыўнёс шмат навізны ў гучанне інструмента. Пасля выступлення нашай Сашы зала ўставала. І яшчэ яна іграла акапэльна беларускія мелодыі — у цішыні залы яны ўспрымаліся цудоўна... Мы часам пачынаем адчуваць велічы і каштоўнасць гэтага інструмента, калі вязём яго за мяжу і там кажуць: гэта неверагодна. А тады і мы ўжо падтрымліваем: о, як цудоўна. Я лічу, што па сваёй сутнасці мы яшчэ не сфарміраваліся ў сваёй незалежнасці, і гэта праяўляецца ў стаўленні да сваёй паэзіі, гісторыі, музыкі і наогул культуры.

Я лічу, што на сённяшні дзень нашы выканаўцы на цымбалах дасягнулі бліскучых вяршынь, і ўжо сам інструмент у многім з'яўляецца тормазам выканальніцкага майстэрства — ён патрабуе ўдасканалення. Спачатку гэта быў інструмент дыятанічны, потым у 30-я гады Жыновіч і яго паплечнікі зрабілі рэканструкцыю цымбалаў, пашырылі іх магчымасці, прыняўшы дыяпазон скрыпкі. Мы дагэтуль іграем на тым рэканструяваным інструменце. Але цяпер гаворка ідзе пра тое, што патрэбна лабараторыя па вывучэнні магчымасцяў гэтага інструмента, ён патрабуе некаторых пераўтварэнняў, якія б далі вялікі штуршок у развіцці выканальніцтва на цымбалах.

РАЗУМЕННЕ

— У цымбальнай званіцы цэлыя стагоддзі адлюстраваны. Нездарма ж кажуць: звановы ўдар цымбал... Нібыта храмавае гучанне — у ім столькі сутнасці, думкі, пачуцця, філасофіі. Але калі гучаць хоры цымбал — у гэтым шмат мужнасці. Не крыку, але спеву харавога. Цымбалы ў многім блізкія самой прыродзе спеваў. У гэтым іх вялікая сіла. І нават калі трэмала ў цішыні — больш шчыміліва-асабістага вы не знойдзеце... Вядома, у кожнага чалавека свая вобразнасць. Ён можа аддацца паэтычнаму настрою сам-насам — цудоўна, калі цымбалы дапамагаюць.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Кінакрокі

СУМЕСНАЕ ВАЛОДАННЕ КОДАМ

Капрадукцыя ў кінематографе як панацэя

Давайце пагаворым пра будучыню беларускага кіно. Дакладней, пра шляхі развіцця іграва кіно. Яшчэ дакладней: ці з'яўляецца курс на капрадукцыю (праекты сумеснай вытворчасці) панацэяй? Ключ да стварэння такой сістэмы, у якой беларускі кінематограф атрымае другое дыханне, шукаецца даўно, але ці магчыма знайсці рэальна дзейсны спіс захадаў? Жалезных, стапрацэнтных, эфектыўных. Кіно, магчыма, самая непрадказальная сфера мастацтва і самая дарагая. Таму развіваецца метадам спроб і памылак, і гэтыя спробы і памылкі абыходзяцца дорага. Магчыма, таму наш час стаў «эпохай развітога прагматызму», а капрадукцыя — не выключэннем, а тэндэнцыяй. Другой тэндэнцыяй, якую «Звязда» вылучае ў сучасным кінапрацэсе краіны.

Першай было камерцыйнае/рэкламнае кіно на прыкладах у мастацкіх адносінах простых фільмаў «Вось гэта каханне!», «Нерэальнае каханне» і «З 8 сакавіка, мужчыны!». Усе тры карціны пэўным чынам карэлююць з сённяшняй тэмай: кожная з іх створана сумеснымі намаганнямі кінавытворцаў Беларусі і Расіі, што значыць — у капрадукцыі. Атрымаліся з гэтага вопыту немудрагелістыя прыгодніцкія меладрамы, якія хоць і затрымліваюць масавага гледача ля экрана з беларускім фільмам, але ў глабальным сэнсе не робяць гонару нашаму кіно.

У той жа час самыя яркія карціны апошніх гадоў у спісе нацыянальнай кінастудыі — тыя, што займаюць нішу фестывальнага аўтарскага кіно, зроблены менавіта ў капрадукцыі. Гэта стужка «У тумане» Сяргея Лазніцы, у стварэнні якой, акрамя Беларусі, удзельнічалі Расія, Германія, Нідэрланды і Латвія. Гэта чорна-белая «Роля» Канстанціна Лапушанскага — сумеснай вытворчасці Беларусі, Расіі, Германіі, Фінляндыі. Гэта і фільм «Я не вярнуся» Ільмара Раага з удзелам Беларусі, Эстоніі, Расіі, Фінляндыі і Казахстана. Вось наша так званае кіно «не для ўсіх». Кожны з прыкладаў удзельнічаў у конкурсе кінафестывалю «Лістапад» (што паказвае на пэўны якасны ўзровень), а карціна «У тумане», больш за тое, атрымала «золата».

Глабалізацыя ў кінематограф увайшла ўпэўненым крокам. Сведчыць пра гэта і сусветная тэндэнцыя на стварэнне праектаў сумеснай вытворчасці, і транснацыянальныя галівудскія кангламераты, і ўніверсальныя кінапраекты, цікавыя розным культурам.

Не толькі мінскі кінафестываль адзначыў фільм Сяргея Лазніцы. Экранізаваная аповесць Васіля Быкава прыйшлася даспадобы публіцы ў Канах, дзе экзістэнцыйная карціна атрымала прыз ФІПРЭСІ (Міжнароднай федэрацыі кінапрэсы) як лепшы фільм асноўнага конкурсу. Шэраг іншых фэстаў — «Люстэрка» імя Андрэя Таркоўскага, «Залаты абрыкос» у Ерэване, Адэскі міжнародны кінафестываль — таксама знайшлі ў стужцы «У тумане» мастацтва і адзначылі сваімі ўзнагародамі.

«Роля», гісторыя якой развіваецца падчас і пасля грамадзянскай вайны ў Расіі 1920-х, таксама не аўтсайдар фестывальнай тусоўкі: карціна Канстанціна Лапушанскага ўдзельнічала ў Маскоўскім міжнародным кінафестывалі. Кажуць, рэжысёр карціны пры ўзвядзенні дэкарацый выглядваў кожны сантыметр, ставіўся да праекта вельмі трапятліва, што паказальна. Галоўную ролю ў фільме выканаў Максім Суханаў, тут ён — геніяльны акцёр Яўлахаў, які ўзяўся за «жывую» ролю памерлага камандзіра чырвоных Плотнікава. «Чыстае мастацтва», — чуецца ў сценах нацыянальнай кінастудыі ў адрас гэтай карціны, а чыстага мастацтва ў наш прагматычны час не хапае.

Трэцім фестывальным фільмам з'яўляецца карціна эстонскага рэжысёра Ільмара Раага (аўтара фільмаў «Клас», «Керту», «Эстонка ў Парыжы») «Я не вярнуся», якая прагучала ў навінах апошняга часу і на кінафестывалі «Лістапад» гэтага года. На мінскі форум стужка прыехала ўжо з паслужным спісам і атрымала прыз Прэзідэнта «За гуманізм і духоўнасць у кіно». У актыве фільма ўзнагарода «Спецыяльная згадка журы» Нью-Ёркскага фестывалю Tribeca, адным з заснавальнікаў якога з'яўляецца Роберт дэ Ніра, прыз «За прафесійныя дасягненні» на кінафестывалі «Люстэрка» імя Андрэя Таркоўскага.

У выніку ўсё лепшае нашай індустрыі іграва кіно створана ў капрадукцыі, але тэндэнцыя на супрацоўніцтва не з'яўляецца фішкай, уласцівасцю, характарам менавіта беларускага кіно. Глабалізацыя ў кінематограф увайшла ўпэўненым крокам. Сведчыць пра гэта і сусветная тэндэнцыя на стварэнне праектаў сумеснай вытворчасці, і транснацыянальныя галівудскія кангламераты, і ўніверсальныя кінапраекты, цікавыя розным культурам. Чуюцца гучныя заявы аб тым, што нацыянальнае кіно памерла.

У стратэгіі развіцця беларускага кіно, што разлічана на 2015-2020 гады таксама, прапісана фінансаванне праекта на стварэнне нацыянальнага фільма. Аднак не прапаноўваецца замыкацца на «ўсім беларускім». Выдатнага нацыянальнага іграва фільма ў нас няма — у той час як сінергія ў працы над кінапраектамі дае добрыя вынікі. Можа, капрадукцыя — і ёсць наш спосаб выхаду з крызісу і магчымасць ствараць выдатнае кіно?

Напрыклад, Украіна пачала ўдзельнічаць у сумеснай кінавытворчасці нядаўна, прыкладна чатыры-пяць гадоў таму, калі былі створаны адны з першых праектаў: «Шчасце маё» Сяргея Лазніцы (фільм быў намінаваны на «Залатую пальмавую галінку» ў Канах), «У суботу» Аляксандра Міндадзэ, «Істальгія» Дар'і Анішчанкі.

Кадр з фільма «У тумане» Сяргея Лазніцы.

У сучасным кінематографе Украіны назіраецца некаторы ўздым, і не апошнюю ролю ў гэтым адыграла новая сістэма дзяржфінансавання: з 2011 года для кінагаліны дзейнічае конкурс, пераможцы якога могуць атрымаць не больш за 50% кошту карціны (прыкладна такая ж сістэма дзейнічае ў Беларусі з 2012 года). У выніку чаго — нашумелае «Племя» Міраслава Слабашпіцкага, пераможца апошняга «Лістапада», або фільм «Павадыр» Алеся Саніна, які Украіна адправіла на «Оскар».

Вядома ж, гэта іншы рынак і іншыя ўмовы, але ў нас шмат падабенства. У Беларусі з-за невялікай колькасці кінатэатраў фільм нацыянальнай вытворчасці не можа акупіцца, ва Украіне на практыцы — таксама. Прыватныя кампаніі, якія плануюць зарабіць, вымушаны прыцягваць долю дзяржбюджэту. Толькі прайшоўшы конкурс, можна ісці на апраўданую рызыку, шукаючы іншыя крыніцы і ўкладваючы ў праект свае грошы.

Паводле слоў украінскага прадзюсара Алега Шчарбіны (кампанія Fresh Production Group), капрадукцыйны праект становіцца даражэйшым. «Але прыцягнуць інвестыцыі ва Украіне вельмі складана, таму выгадней ісці на падаражэнне бюджэту, пры гэтым атрымліваць жывыя грошы, за якія здымаюць канкрэтны аб'ём матэрыялу». Сумесная вытворчасць дае пэўныя бонусы, дзеля якіх гэтая цяганіна апраўданая. Напрыклад, магчымасць прыцягнення сур'ёзных еўрапейскіх кінематаграфістаў, або гарантыя таго, што замежны партнёр будзе зацікаўлены ў прасоўванні карціны. Адным словам, капрадукцыя — гэта выгадна.

У Беларусі з-за маленькай колькасці кінатэатраў фільм нацыянальнай вытворчасці не можа акупіцца, ва Украіне на практыцы — таксама.

У самой Украіне назіраецца заканамерная цікавасць да нацыянальнага кіно: «Улічваючы нацыянальны ўздым, фільм таго ж класа, але ўкраінскі збярэ ў пракаце больш. Капрадукцыя таксама трапляе ў гэтую катэгорыю, калі зразумела, што фільм мае нейкія культурныя, філасофскія ці іншыя да нас адносіны».

Грузія сёння стварае ў капрадукцыі большасць ігравых фільмаў і нядрэнна ў гэтым вызначылася. Сёлета дзве карціны — «Кукурузны востраў» Георгія Авашвілі і «Мандарыны» Заза Урушадзэ — трапілі ў шорт-ліст прэміі «Оскар» намінацыі «Лепшы фільм на замежнай мове», абедзве карціны ствараліся сумесна з замежнымі партнёрамі. У Грузіі таксама назіраецца некаторы ўздым, рэнесанс кіно — магчыма, дзякуючы выбранаму курсу на капрадукцыю. Больш актыўны ўдзел у сумеснай кінавытворчасці пачаўся, таксама як у Беларусі і ва Украіне, у 2009-2010 гадах, але ўжо сёння гэта самая папулярная схема кінавытворчасці.

Максім Суханаў у фільме «Роля» Канстанціна Лапушанскага.

У Грузіі няма дзяржаўных кінастудый, апроч «Грузія-фільм», якая існуе намінальна. Праекты фільмаў падаюцца ў Нацыянальны кінацэнтр, дзе праводзіцца некалькі конкурсаў — на поўнаметражнае кіно, дакументальнае, анімацыйнае, дэбютнае, кароткаметражнае і асобны конкурс для фільмаў сумеснай вытворчасці, які атрымлівае ад агульнага пірага 12-15% бюджэту. Праект фільма можа прэтэндаваць не больш чым на 75% фінансавання.

Такая схема прывяла да ўздыму грузінскага кіно. Два фільмы ўдзельнічалі ў асноўным конкурсе апошняга кінафестывалю «Лістапад» — той самы «Кукурузны востраў» і «Сляпыя спатканні» Левана Кагуашвілі. «Мандарыны» намінаваны на «Залаты глобус».

«Беларусьфільм» усё больш працуе над сумеснымі праектамі і ўпэўнена робіць на гэтым акцэнт. 2015 год, забягаючы наперад, рыхтуе нам нядрэнныя сюрпрызы, пра якія пагаворым у свой час. На прыкладзе Украіны мы бачым, што сістэма фінансавання па конкурсе ў міністэрстве — правільны шлях, дзякуючы якому могуць развівацца прыватныя кінастудыі. На прыкладзе Грузіі — што «нацыянальнае кіно» можа стварацца сумесна з замежнымі калегамі. Таму «У тумане», «Роля», «Я не вярнуся» — толькі пачатак, і з цягам часу, спадзяемся, нашыя фільмы-капрадукцыі змогуць прэтэндаваць на «Залатую пальмавую галіну» і «Оскар».

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Вилейского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион

по продаже здания конторы общепита,

инвентарный номер 631/С-62294, общ. пл. 71,9 кв.м, расположенного по адресу: Республика Беларусь, Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина.

Начальная цена с НДС – 61 000 000 бел. руб.

Площадь земельного участка **0,1378 га** (предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания конторы общепита).

Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска, ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 11.09.2014 г.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона.

Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится 11.02.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.02.2015 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.**

Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-183-69-71. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-16473 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – автозаправочная), площадью 60,0 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 256. Составные части и принадлежности: резервуар № 1, № 2, № 3, № 4, № 5, линия электропередачи 0,4 кВ, благоустройство.
Обременения на объект со стороны 3-х лиц	Право аренды комплекса автозаправочной станции (здание АЗС – площадь 60,0 кв.м, сооружения (емкости) в количестве 5 штук, асфальтно-бетонное покрытие площадью 6160 кв.м) сроком по 31.12.2015 г.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001003764 (назначение – земельный участок для обслуживания автозаправочной станции), площадью 0,2523 га, расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Суворова, 256. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередач, код – 6, площадью 0,0030 га; земли, находящиеся в охранных зонах водопроводных коллекторов, код – 7, площадью 0,0265 га; земли, находящиеся в охранных зонах канализационных коллекторов, код – 7, площадью 0,0804 га.
Начальная цена продажи	1 742 770 000 (один миллиард семьсот сорок два миллиона семьсот семьдесят тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	87 138 500 (восемьдесят семь миллионов сто тридцать восемь тысяч пятьсот) белорусских рублей
Продавец	ОАО «Гроднооблавтотранс», 230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 25, тел. 72-19-57
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 04 февраля 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 18.09.2014 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), и с 8.30 до 16.30 (пятница).

Последний день приема заявлений – 29 января 2015 г. до 15.00.

Телефон для справок: 41-98-32, 41-98-34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩЕНИЕ

19.01.2015 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Восточная, 133, офис № 1 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Белбуд»

Форма проведения — очная.

Повестка дня: рассмотрение вопроса о финансировании Обществом строительства инженерной и транспортной инфраструктуры, необходимой для эксплуатации объекта «Многоквартирные жилые дома по генплану №№ 4, 5 со встроенными помещениями общественного назначения и подземными гараж-стоянками по пр. Победителей в границах жилого района Лебяжий» (введен в эксплуатацию 29.08.2014).

УНП 100794022

21 января 2015 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1) О совершении сделок общества.

2) О выпуске облигаций общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 14.01.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНП 200295903

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	Капитальное строение, инв. № 450/С-26291 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), площадью 115,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1А. Составные части и принадлежности: 2 пристройки
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425450100001006522, площадью 0,0177 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий магазина), расположенный по адресу: г. Слоним, ул. Фабричная, 1А
Начальная цена продажи	83 902 009 (восемьдесят три миллиона девятьсот две тысячи девять) белорусских рублей без учета НДС
Сумма задатка	8 390 201 (восемь миллионов триста девяносто тысяч двести один) белорусский рубль
Продавец	Слонимский филиал Гродненского областного потребительского общества, г. Слоним, ул. Маяковского, 6, тел. 8-01562-215-91
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225

Аукцион состоится 21 января 2015 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

